Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej 18
ISSN 1898-4215; e-ISSN 2544-3143
Copyright © by Viktar Yakubau 2025
Creative Commons: Uznanie Autorstwa 4.0 (CC BY 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/
https://doi.org/10.31338/2544-3143.si.2025-18.1

*Віктар Якубаў*
Uniwersytet Warszawski
yakubau@yahoo.com
https://orcid.org/0000-0002-5239-1598

# УДЗЕЛ ГРАМАДЗЯН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ВАЕННЫХ КАМПАНІЯХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ НА ТЭРЫТОРЫІ МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ 1609–1613 ГГ.

## Participation of Citizens of the Grand Duchy of Lithuania in Military Campaigns of the Polish-Lithuanian Commonwealth on the Territory of the Moscow State in 1609–1613

### Abstract

The main objective of the article is to establish the participation of citizens of the Grand Duchy of Lithuania during the period of the greatest success of the Polish-Lithuanian Commonwealth in the military campaigns against the Muscovite State in 1609–1613 (the capture of Smolensk, the Battle of Klushino, the holding of Moscow by a garrison of soldiers from the Polish-Lithuanian Commonwealth 1610–1612) and their consequences for the GDL society. Based on the analysis of sources, the conclusion was drawn about the uneven participation of captains and individual soldiers of the “Lithuanian and Ruthenian people” of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish Crown in all these campaigns. Since in November 1609 the main army of the Grand Duchy of Lithuania was fighting a war with the Swedes over Inflanty, only the private companies

of Sapiecha, Wołłowicz, Wiesiołowski and Gąsewski led the king to Smolensk, therefore initially, at Kłuszyno and in the Moscow garrison, most of the field armies of the Commonwealth consisted of people of Polish and Ruthenian origin from the Crown of Poland. The situation changed after November 1610, when first S. Żółkiewski left Moscow, and at the end, in spring 1613, when Z. Silnicki left Smolensk. The authority and responsibility for saving the garrison in the Kremlin and Smolensk and securing the war against the general Muscovite movements fell on the shoulders of the representatives of the Grand Duchy of Lithuania (A. Gąsewski, J.P. Sapieha, J.K. Chodkiewicz, J. Budziłło, E. Strawiński, A. Lisowski). Since the society of the Grand Duchy of Lithuania suffered greatly from the invasions of the enemy, both the Crown and its own soldiers, confederates and bands of rioters, without waiting for the decision of the general Sejm, in 1613–1614 it introduced and collected extremely high taxes on its territories, paying the enormous bills of its own army, organized itself at the district level and began to effectively repel the invaders on its own.

**Keywords**: Grand Duchy of Lithuania, Klushino 1610, Moscow 1610–1612, Smolensk 1609–1611, tsar, army, sailor

Галоўнай мэтай знешняй палітыкі Жыгімонта Вазы было вярнуць сабе ўладу над Швецыяй. Зыходзячы з сітуацыі працяглага дынастычнага крызісу ў Маскве і падтрымкі Гадуновымі і Шуйскімі войска Карла IX (які пазбавіў Жыгімонта Вазу ўлады ў Швецыі і веў вайну з войскам Вялікага Княства Літоўскага [далей – ВКЛ. – В. Я.] у Інфлянтах з 1600 г.), планы караля прадугледжвалі, як мінімум, аслабіць ці зрабіць саюзнікам Вялікае княства Маскоўскае [далей – ВКМ. – В. Я.] праз атрымання царскай шапкі „царэвічам" Дзмітрыям або, як максімум, цалкам інтэграваць суседа праз унію ці захапіць сілай. З пачаткам Смуты авантурысты і насельніцтва памежных рэгіёнаў уключылася ў рабаванне суседзяў і войска Самазванцаў[1], але сенатары ад ВКЛ на чале з Радзівіламі, Хадкевічамі і Сапегамі працягвалі блакіраваць напад на Вялікае княства Маскоўскае, аргументуючы сваю адмову вайной са Швецыяй у Інфлянтах і небяспекай удара ў адказ па іх тытульных уладаннях і трыманнях на Беларусі (Нясвіж, Слуцк, Шклоў, Быхаў, Чарэя, Магілёў).

[1] Нацыянальны Гістрычны Архіў Беларусі (НГАБ), КМФ-18, спр. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375.

Падчас рокашу 1606–1609 г. у межах Рэчы Паспалітай знаходзілася блізу 20 000 жаўнераў[2], якія моцна прыціскалі насельніцтва ў складзе канфедэрацый інфлянцкага войска, каралеўскіх і магнацкіх рот: як ракашан (А. Лісоўскі, К. Стаброўскі, С. Казімерскі, С. Тышкевіч, П. Руцкі), так і рэгалістаў (М. Мяхоўскі, Я. П. Сапега, А. Збароўскі, М. Харлінскі). Пасля развязкі збройнага супрацьстаяння ў ВКЛ летам 1608 г. большасць з іх хвалямі зышлі ў войска Ілжэдзмітрыя II, але частка заставалася ў краіне[3]. Таму Варшаўскі вальны сойм (15.01.1609 – 26.02.1609) скіраваў ухваленыя падаткі на выплату войскам у Інфлянтах, іх канфедэрацыям і прадухіленню іншых небяспекаў, але не на пачатак новай вайны з Масквой[4]. Ужо вясной 1609 г. антываенны настрой паслоў і сенатараў змяняецца. Стомленыя рабаўніцтвам былых ракашан і вайсковых канфедэратаў, літоўскія сенатары прапанавалі каралю вывесці жаўнераў ці ў Інфлянты, ці пад Пскоў і Вялікія Лукі[5]. Асноўнае войска ВКЛ (роты Хадкевічаў, Радзівілаў, Валовічаў, Кішак, Нарушэвічаў, Глябовічаў)[6] знаходзілася ў Інфлянтах да кастрычніка 1609 г.

Да жніўня 1609 г. Жыгімонт Ваза прыехаў у Вільню, дзе спрабаваў пераадолець унутрыпалітычны супраціў магнатаў ВКЛ яго планам інтэрвенцыі на усход. Толькі атрымаўшы звесткі аб перамогах войска ВКЛ у Інфлянтах вясной – летам 1609 г. і аб поспехах 8000 шведаў, немцаў і французаў, дасланых Карлам IX Васілю Шуйскаму супраць сіл тушынцаў, а так сама абяцаннях яго ворагаў у далейшым падтрымліваць адно аднаго супраць ВКЛ, кароль без афіцыйнага дазволу вальнага сойму

[2] В. Якубаў, *Удзел Грамадзян ВКЛ у войску II Ілжэдзмітрыя 1608–1610 г.*, „Przegląd Środkowo-Wschodni", 2024, № 9, s. 9–49, А. Пшепюрка, *Поляки на службе Самозванцев*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. Москва, 24–26.10.2012 г.*, Москва 2016, с. 188.

[3] А. Пшепюрка, *Поляки на службе Самозванцев…*, op. cit., с. 192.

[4] А. Дземідовіч, *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінах Рэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021, с. 61.

[5] Archiwum Narodowe w Krakowie (byłe Archiwum Państwowe na Wawelu), Archiwum Sanguszków (APW, AS), №51.

[6] Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłów (AGAD. AR.), dz. II. Suplement., sygn. 238, s. 2–3.

і сенату Рэчы Паспалітай абвесціў аб пачатку паходу на Смаленск і вырушыў з Вільні на Маскву[7].

16 верасня 1609 г. жаўнеры ВКЛ, прадстаўленыя ротамі, аплочанымі Львом Сапегам, Пятром Весялоўскім і Аляксандрам Гасеўскім, першымі з'явіліся пад мурамі Смаленска. Пад Воршай 17 верасня 1609 г. Жыгімонт Ваза заклікаў смялян сустракаць яго „хлебам-соллю", бо як „бліжэйшы родзіч Рускага гаспадарства", паабяцаў вярнуць спакой Маскоўскаму гаспадарству і суцішыць „Гнеў Гасподні", які праліўся на „народ рускі маскоўскі" з-за заняцця стальца людзьмі „не царскага роду" пасля смерці Федара Іванавіча, у выглядзе братазабойчай вайны ўсіх са ўсімі і „немцаў, якія ідуць забіраць замкі і веру праваслаўную рускую замяніць на сваю ерытычную"[8]. 19 верасня 1609 г. з каралём падышлі каронныя сілы. Да іх па шляху далучыліся роты іншых паноў ВКЛ: Дарагастайскіх, Весялоўскіх, Скумін-Тышкевічаў, Валовічаў[9], пазней – мазырскага пісара Пятра Аскеркі[10], Марціна Горскага і Багдана Катла[11].

Агульныя сілы Польскага каралеўства і магнатэрыі ВКЛ, маючы каля 8450 кавалерыі і 4530 пяхоты (пазней падышло каля 10 тысяч запарожцаў), з верасня 1609 да 3 чэрвеня 1611 г. беспаспяхова штурмавалі Смаленск – выдатна забяспечаную сучасную крэпасць з 38 вежамі, 5000 расейска-шведскай залогі, каля 15000 узброеных мяшчан, 170 гарматамі і запасам пораха, якога маскоўцам хапіла да канца аблогі.

Восенню 1609 г. войскі Жыгімонта Вазы цяжкой артылерыі не мелі зусім. Каралеўскія жаўнеры амаль год чакалі бурачых муры гармат з Полацку, бо тыя, што былі ўзятыя з Вільні, „зваліліся". Пад кіраў-

[7] Biblioteka książąt Czartoryskich (BCzart), sign. 104, № 189, 188.

[8] Geheimes Staatsarchiv Preußisher Kulturbesitz. XX Herzogliches Briefarchiv (GStA XX HBA (H). Kasten). Сакрэтны дзяржаўны архіў Прускай культурнай спадчыны, Архіў лістоў князёў, скрыня №850.

[9] GStA XX HA Königsberg Ostpreußishe Staatsarchive. Kriegssachen. Folianten (GStA XX HA Ostpr. K. Fol.). Сакрэтны дзяржаўны архіў Прускай культурнай спадчыны. Кёнігсбергскі Усходнепрускі Дзяржаўны Архіў. Справы вайны, фаліянт № 815, арк. 321.

[10] НГАБ КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 26–26а.

[11] НГАБ КМФ-18, спр. 86, воп. 1, арк. 851, 866. Прывілеі Марціну Горскаму і Багдану Катлу ў 1611 г. вызначаны юргельды (1400 коп і 700+120 зл. штогод) з прыбыткаў ВКЛ за службу у тл. пад Смаленскам; BCzart, sign. 104, № 216.

ніцтвам французкіх і нямецкіх інжынераў яны капалі валы і падкопы пад бастыёны цверджы. Толькі летам 1610 г. пад муры была прывезена штурмавая артылерыя, якую па просьбе Я. К. Хадкевіча дала Рыга[12]. Смаляне яе падарвалі. Наступную батарэю са свайго Слуцка, ужо па просьбе Л. Сапегі, восенню 1610 г. на паслугі дзяржаве прадставіў былы маршалак рокашу Януш Радзівіл. Менавіта яна прабіла муры Смаленска 3.06.1611 г. Увесь час аблогі праца была мазольнай, а баі – зацятымі. За гераізм і раненні пад Смаленскам і ўдзел у трох штурмах раней асуджанаму забойцу Яну Бернацкаму кароль вярнуў літоўскае шляхецтва[13]. Апроч упартасці гарнізона, менавіта артылерыя і запасы абложаных сталі прынцапова важным фактарам, бо колькасць гармат і ў першай, і ў другой штурмавой батарэі ВКЛ не перавышала 30.

Сродкі для працягу аблогі зімой 1611 г. скарбу ВКЛ прадставілі не толькі магнаты, але і купцы. Гданьскія фактары Ф. Шрэк і Г. Хейн (12000 і 8000 зл.) пад пераняцце ў нябожчыка Пятра Казімірскага, які вадзіў мясцовых стральцоў на войны, гарадзенскіх Адэльскай і Крын(каў)скай пушчы і бязмытны сплаў у Каралявец і Гданьск, а рыжскія фактары (Э. Ван Карпен, М. і Б. Любарты) узялі ў арэнду смаленскія пушчы за Касплей на 4 гады з аплатай 7000 гатовых злотых за год[14].

Пакуль войска караля і магнатаў двору захраслі амаль 2 гады пад Смаленскам, на іншых тэатрах баявых дзеянняў разгарнуліся дынамічныя падзеі. Прыгадаем, што ў гэты час на тэрыторыі Маскоўскага вялікага княства ў складзе армій Самазванца знаходзіліся найміты з Кароны і ВКЛ, гетманамі якіх былі Р. Ружынскі і Я. П. Сапега. Жыгімонт Ваза і яго паслы, што прыязджалі да ваяроў з Рэчы Паспалітай у Тушына і Троіцу, ніколі не прызнавалі Ілжэдзмітра II царом. Яны спрабавалі пераманіць сваіх суайчыннікаў да сябе пад Смаленск, але не прызнавалі даўгоў, які нарабіў Самазванец перад наймітамі. Калі аб'яднанымі палкамі Я. П. Сапегі, Р. Ружынскага і Э. Стравінскага не ўдалося спыніць прасоўванне 1330 шведскай кавалерыі, 900 пяхоты і 50 000 расейскіх апалчэнцаў М. Скопіна Шуйскага да Масквы, Ілжэдзмітры II уцёк ў Калугу. Абодва гетмана войска Самазванца

---

12 *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, Wilno 1838, s. 13, 16.

13 НГАБ КМФ-18, спр. 293. воп. 1, арк. 52.

14 НГАБ КМФ-18, спр. 86, воп. 1, арк. 832, 834, 841, 843.

(Я. П. Сапега і Р. Ружынскі), „каб тое, што ўзялі не згубіць" і ў спадзяванні, што „Рэч Паспалітая, як матка сваіх дзеці, ня будзе замест кроўную заробленага імі хлеба каменнем карміць", даслалі паноў Рудога, (Мікалая) Мархоцкага і Дудзінскага да Жыгімонта Вазы на перамовы аб пераходзе пад яго ўладу разам з іх зонамі кантроля[15].

Калі 4 кастрычніка 1609 г. першы штурм Смаленска праваліўся[16], войска Жыгімонта Вазы перайшлі да аблогі. У лістападзе 1609 г. Петр Весялоўскі, які асабіста быў там, праз мур чуў „бунты, плач, крык і стрэлы". Ен лічыў, што толькі пастаўленыя з Масквы смаленскі метрапаліт і ваявода ўпяраліся, і калі Шуйскі не прыйдзе праз пару тыдняў – горад здасца. Тым больш, смаляне „плакаліся, што хаця літва ім усе забярэ, але ім абы з дзецьмі і з жонкамі застацца", палонных з Рэчы Паспалітай у вязенні „ня сільна мучаць", нават „па некалькі дзенег даюць ім на страву". Паслы ад Жыгімонта Вазы, „ў справах маскоўскіх беглыя", на чале з перамышльскім кашталянам Станіславам Стадніцкім паехалі да палкоўнікаў ілжэдзмітравага войска на месцы іх дыслакацыі, паабяцалі пераканаць і прывесці трохтысячны полк А. Збароўскага, палкі Л. Вэйгера, Скумін Тышкевіча, Дамарацкага, а да таго ж вялі перамовы аб далучэнні з А. Млоцкім, які меў 4000 капійнікаў. 6000 казакоў, што з'ехалі „ад Дмітрыя", сталі пад Белай і Вязмай, пачалі іх здабываць і папрасілі караля даслаць ім харугвы[17]. На вясну 1610 г. каралеўскія войскі занялі Белую, Старыцу, Дарагабуж, Вязьму, Мажайск. Полк князя Януша Парыцкага[18], які быў накіраваны з пад Смаленска збіраць харчаванне, захапіў Бранск і Раслаўль.

Канфедэрацыі інфлянцкага войска 1604–1609 г. разаралі каралеўскія эканоміі і блакавалі зборы з іх, разлікі вычэрпвалі скарб, а соймы ня ўхвалялі агульнадзяржаўных падаткаў на вайну з Масквой: ня маючы фінансавых рэзерваў, Жыгімонт Ваза ня мог выканаць жаданне тушынцаў і ўзяць на сабе гіганцкія запазычанасці, якія нарабіў Самазванец перад найміткамі з Рэчы Паспалітай. Пасля шэрагу

[15] AGAD. AR. II. Suplement., sygn. 243.

[16] R. Szczęśniak, *Kłuszyn 1610*, Warszawa 2004, s. 31–32.

[17] GStA XX HA Ostpr. K., fol., №815, арк. 321, арк. 323.

[18] У жніўні 1606 г. Януш Парыцкі атрымаў юргельд у 1000 зл. за ваенныя паслугі ад скарбу (ВКЛ. НГАБ КМФ-18, спр. 86, воп. 1, арк. 633).

перафарматаванняў у красавіку 1610 г. на службу караля ўсё ж прынялі полк А. Збароўскага (каля 4000 шабляў), але войска Я. П. Сапегі (2056 коні гусараў, 1600 пяцігорцаў, 1100 казакоў) дамовіліся аб пераходзе на службу каралю толькі 6.09.1610. Каб не паўтарацца[19], варта пагадзіцца з А. Пшэпюркам, які лічыць, што сярод нанятых з удзельнікаў Дзмітрыядаў пераважную колькасць не толькі сярод пахолкаў і казакоў, але з таварыства гусарскіх рот складалі выхадцы з рускіх (беларускіх і украінскіх) земляў ВКЛ і Кароны[20].

Складанасці ў перамовах з каралём аб аплаце службы на Самазванца сталі прычынай таго, што частка жаўнераў засталася ці вярнулася да Ілжэдзмітрыя II. 24.06.1610 г. войска наемнікаў Ілжэдзмітрыя II абрала Я. П. Сапегу сваім гетманам. Праз месяц 2 палкі запарожцаў (Касцінецкага і Друшлака) і 2 палкі капійнікаў (Хруслінскага і Я. Скуміна Тышкевіча) сталі асноўнай сілай, якая дапамагла тушынцам вярнуцца другі раз пад Маскву[21].

У канцы вясны 1610 г. у лагеры каралеўскага войска пад Смаленскам Ян Патоцкі і Л. Сапега пачалі бунтаваць таварыства, незадаволенае доўгім стаяннем пад мурамі, але самі адмовіліся ісці, таму кароль вылучыў палявую армію (1130 вершнікаў і 400 пяхоты) і перадаў кіраванне ёй кароннаму польнаму гетману С. Жалкеўскаму[22]. У сітуацыі, калі кароль не прызначаў вялікага кароннага гетмана (а яна цягнулася з 1605 г.), а на тэатры баявых дзеянняў з'явіўся вялікі гетман літоўскі, ён станавіўся паводле пасады старэйшым над польным гетманам каронным. Але Я. К. Хадкевіч у гэты час быў у складзе гарадзенскіх канфедэратаў. 8.06.1610 Жыгімонт Ваза накіраваў іх на дапамогу аддзелам ВКЛ і тысячы запарожцаў А. Гасеўскага, якіх абклалі ў Белай маскоўскі ваявода І. Хаванскі і „немцы" (шведы) Э. Хорна. „Немцаў" пад Белай 14 чэрвеня С. Жалкеўскі не застаў, бо на чуткі аб набліжэнні караняжаў

[19] В. Якубаў, *Удзел Грамадзян ВКЛ у войску II Ілжэдзмітрыя 1608–1610 г....*, op. cit., с. 37–39.

[20] А. Пшепюрка, *Поляки на службе Самозванцев...*, op. cit., с. 189–191.

[21] *Дневники Яна Петра Сапеги*, [в:] *Памятники Истории Восточной Европы. Источники XV–XVII в.*, сост. И. Тюменцев и др., Москва 2012, т. IX, с. 204.

[22] T. Bohun, *Moskwa 1612*, Warszawa 2005, s. 31.

шведы адышлі насустрач асноўным сілам Дзмітра Шуйскага, якія рухаліся з Масквы на Смаленск, а Хаванскі адвеў свой полк за Ржэў і Волгу.

Пасля разблакіроўкі Белай, А. Гасеўскі забраў з гарнізона казакоў Збароўскага, Пяскоўскага і Іванішы і выйшаў на Шуйск (в. Шуйскае) за Вязьму, дзе пачаў будаваць апорны лагер для далейшага руху на ўсход. Полк А. Млоцкага з 2000 казакоў, схадзіўшы ў набег пад Ржэў, далучыўся да іх. Маскоўскі авангард войска Шуйскіх у 4000 жаўнераў на чале з Г. Валуевым, спыніўся насупраць Шуйска каля Царовага Займішча і збудаваў там астрог. Менавіта ў Шуйску, негледзячы на ранейшыя асабістыя канфлікты правадыроў, да палявых сілаў С. Жалкеўскага далучыліся палкі тушынцаў-караняжаў А. Збароўскага, М. Казаноўскага, С. Дунікоўскага, заблакаваўшы астрог у Царовым Займішчы сіламі 700 вершнікаў, 800 пяхоты і 3000 запарожцаў на чале з Якубам Бабоўскім[23]. Выведачная чата пад зверхнасцю Шчаснага/Фелікса Невяроўскага ці Яна Невядомскага[24] 3 ліпеня даставіла кароннаму гетману інфармацыю аб лакалізацыі варожага войска[25]. На падмурку гэтых дадзеных С. Жалкеўскі прыняў рашэнне разбіць арміі ворага паасобку. Вялікі каронны гетман патаемна ад абложаных рушыў на асноўныя маскоўскія сілы з блізу 5556 гусараў, 279 пяцігорцаў, 679 казакоў ВКЛ і Кароны і 400 казакоў-запарожцаў, 200 пяхоты і 2 гарматамі[26].

24 чэрвеня/4 ліпеня 1610 г. пад Клушынам палявое войска Рэчы Паспалітай узяло ўмацаванні і разграміла па розных звестках ад 23 000 да 35 000 войска Шуйскіх і шведскіх наймітаў Я. Дэлагардзі[27]. Вельмі важную ролю ў бітве адыгралі роты ўдзельнікаў Кірхольмскай бітвы

---

[23] Караняж, род з кракаўскага і люблінскага (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1905, t. I, s. 247).

[24] Ротмістры абодва з Падляшша. Ш. Невяроўскі, жанаты на літвінцы Ганне Езерскай (?), асеў у троцкім ваяводстве, другі – Я. Невядомскі гербу Прус – асеў у аршанскім і навагрудскім павеце (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1915, t. XII, s. 135, 138–140).

[25] R. Szczęśniak, *Kłuszyn 1610*, op. cit., s. 50–59.

[26] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 23–24; R. Szczęśniak, *Kłuszyn 1610*, op. cit., s. 61.

[27] L. Podhorodecki, *Stanisław Żółkiewski*, Warszawa 1988, s. 162; R. Sikora, *Niezwykle bitwy i szarże husarii*, Warszawa 2011, s. 38–39.

А. Млоцкага і Пятра Баркоўскага[28] і палкі былых тушынцаў А. Збароўскага і Людвіга Панятоўскага з ротамі Я. Скуміна Тышкевіча, А. Гасеўскага і Я. Парыцкага. Яны правялі 8-10 атак, злавілі варожую рэйтарыю на перабудове караколю і на іх храбтах прарвараліся за ўмацаванні[29]. Паводле спіску страт пасля бітвы сярод тых пераможцаў, хто атрымаў кампенсацыі, з агулам, 23 рот гусарыі, роты пяцігорцаў і 8 рот казакоў – мінімум у шасці сярод гусарскага таварыства былі абывацелі ВКЛ: у роце А. Млоцкага – забіты ў баі невядомыя па імю Пуцята і „шкадліва паранены" (Адам ці Ян?) Кернажыцкі[30], а так сама Міхаіл Корсак, Андрэй, Себасціян і Вячаслаў Млоцкія, якім забілі коней; у роце Марка Вілямоўскага быў паранены (?) Стэцкевіч; рота Людвіга Вэйгера страціла забітым Якуба Сыцінскага; з роты Януша Скуміна Тышкевіча страцілі коней няназваныя Уніхоўскі, Масальскі і Гедройц, у палку Крыштофа Збароўскага пабіта коні (Тэадор ці Ян Альфонс?) Ляцкаму, а ў палку Януша Парыцкага згубілі коней (?) Юндзіл і Самуіл Маскевіч[31]. Разлік з гэтымі ротамі, як і з інфлянцкімі і смаленскімі залогамі за 1613 г., быў даручаны скарбу ВКЛ[32], што сведчыць аб тым, што ў іх складзе збольшага былі прадстаўнікі ВКЛ.

Баярская дума 17.07.1610 г. скінула Васіля Шуйскага з царства і пачала перамовы з гетманам пераможцаў, каб нацкаваць таго на тушынцаў. Пад уладу Жыгімонта Вазы, які абяцаў „вярнуць законнаць", адчыніла брамы Цвер і шэраг іншых маскоўскіх гарадоў[33]. Па згодзе баярскай думы і з захаваннем колькаснай перавагі ўзброенных сілаў мясцовага баярства ў іх сталіцы туды ўвайшлі войскі з Рэчы Паспалі-

[28] П. Баркоўскі-Дунін сандамірскі харужы, абозны каралеўскі ў 1616 (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1904, t. I, s. 329; R. Szczęśniak, *Kłuszyn 1610*, op. cit., s. 63).

[29] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 33–35.

[30] Род у Менскім ваяводстве (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1909, t. VI, s. 323).

[31] Biblioteka Polskiej Akademii Nauk w Kórniku (BK PAN), rkps. 1591, sygn. 57–64, № 58. Спіс страт жаўнераў пад Клушынам 4 ліпеня 1610; *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 25–27.

[32] Volumina legum, St. Petersburg 1860, t. III, p. 114.

[33] Biblioteka Litewskiej Akademii Nauk imienia Wróblewskiego (Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka (LMAVB), f. 9–431, арк. 143.

тай (ад 5675 да 6583 гусараў і панцырных казакоў, а таксама 800 драбаў „іншаземнага строю" і 400 гайдукоў)[34]. Яны размясцілася наступным чынам: на Крамлі – палкі С. Жалкеўскага (самаго гетмана, Балабана і Малыньскага) і А. Гасеўскага (Аляксандра і Сымона Гасеўскіх і Станіслава Канецпольскага 3 гусарскія і 1 казацкая, Абрахама Асанавіча – татар ВКЛ), 800 „нямецкай" пяхоты і 400 гайдукоў (камандваў імі Пётр Баркоўскі і французскі найміт Жак Мажарэт); у Кітай-горадзе – полк А. Збароўскага (палкоўнікавы „чырвоная", „чорная", „белая", „блакітная" і роты А. Млоцкага, Марка Вылямоўскага, Мікалая Касакоўскага, Якуба Бабоўскага, Шымона Капычынскага, Мікалая Мархоцкага, Адама Ружынскага, Касцюшкоўскага[35], Хадкоўскага, Рудзінскага, Размаўніцкага – гусарскія Аляксандра (Паўла) Руцкага – гусарская і казацкая); у Белым горадзе – палкі Марціна Казаноўскага (палкоўнікава, Януша Парыцкага, Януша Скумін Тышкевіча, Андрэя Фірлея, Гоздзікоўскага – гусарскія, Васічынскага – казацкая) і Людвіга Вэйгера (палкоўніка, Севярына Васічынскага, Самуэля Дунікоўскага, Рагоўскага – гусарскія); Навадзевічы манастыр занялі 4 харугвы з палкоў А. Гасеўскага (Яна Хлюскага[36], Яна Грэчыніна[37]) і А. Збароўскага (Аршанскага[38] і Катоўс-

---

[34] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. Москва, 24–26.10.2012 г.*, Москва 2016, с. 194 – 195.

[35] Хутчэй усяго полк сфармавалі сыны Федара (Мікалай, Рыгор, Петр) ці Івана Касцюшковічы – нашчадкі Касцюшкі Саханавіцкага з Берасцейскага ваяводства, або нехта з Касцшюковічаў з Хабалтова на Валыні (K. Niesiecki, *Herbarz polsk*i, Lipsk 1840, t. V, s. 284; S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1910, t. VII, s. 268).

[36] Вярагодна ВКЛ (K. Niesiecki, *Herbarz polsk*i, Lipsk 1839, t. III, s. 37).

[37] Вярагодней усяго Ян Война Грычына, дзяржаўца мерацкі і краснасельскі, 1615 г. ці нехта з грэкаў (?) берасцейскага ваяводства (K. Niesiecki, *Herbarz polski*, Lipsk 1839, t. IV, с. 277).

[38] Магчыма, Багдан Аршынскі, служылы літвін Табольскага астрога (А. Малов, *Выходцы из Речи Посполитой на службе Михаила Федоровича на завершающем этапе Смуты 1613–1619*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 241).

кага[39])[40]. Атрымліваецца, што Навадзевічы манастыр абаранялі роты ратмістраў ВКЛ, а з 35 рот, якія дума ўпусціла ў Маскву, мінімум ў 12 ротмістраў і частка таварыства былі грамадзянамі ці звязанымі з ВКЛ (дзве Гасеўскіх, Асановіча, Скумін Тышкевіча, Вілямоўскага, Руцкіх, Касцюшковічаў, Хлюскага, Грычыны, Аршанскага, Катоўскага і ў ротах караняжаў – Збароўскага, Ружынскага).

Падчас стаяння пад Масквой з 1 жніўня до 6 верасня 1610 г. паміж рыцарамі з Рэчы Паспалітай з тушынскіх і каралеўскіх войскаў, дзякуючы намаганням і сустрэчам Я. П. Сапегі і С. Жалкеўскага ўдалося пазбегнуць сутыкнення[41]. У выніку перамоваў „уся зямля"[42] на чале з думай пацалавала крыж Уладзіславу Жыгімонтавічу і прызналі яго маскоўскім вялікім князем і царом. Самазванец ўцёк, а „сапежынцы" 6.09.1610 г. перайшлі на службу новага вялікага князя маскоўскага і яго бацькі. Ужо Жыгімонт Ваза і „Сямібаяршчына" (цалкам легітымная баярская дума) скіравалі полк Я. П. Сапегі на Тулу і Калугу збіраць харч для Масквы і блакіраваць сілы Самазванца на поўдні ВКМ.

Першы саюзны баярам і верны цару Уладзіславу гарнізон Масквы склалі войскі пераможцаў з пад Клушына, але пераважалі мясцовыя пасадскія і баярскія палкі. Жалаванне ім павінна было выплочвацца з маскоўскага скарбу, а паколькі той афіцыйна быў пусты – дума вылучыла землі сваёй дзяржавы пад прыстаўствы – „кармленні" жаўнераў. Напрыклад, ротам С. Маскевіча пад зімовы пастой далі Суздаль і Кастраму[43]. Я. П. Сапега працягваў прасіць караля выплаціць яму і яго войску запазычанасць па аплаце за службу на баку Ілжэдзмітрыя II, а Сямібаяршыну – пачаць іх поўнае забеспячэнне, але Жыгімонт

[39] Хутчэй усяго Станіслаў Катоўскі гербу Памян з Жамойці, ці яго сыны ротмістры Ян, Станіслаў ці Андрэй, якія палеглі ў бітвах 1618–1621 з туркамі, але авалодалі значнымі наданнямі на Старадубшчыне (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1910, t. VII, s. 337).

[40] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 62–63; Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., c. 196, Biblioteka Raczyńskich (BRacz.), rkps. 33, k. 254.

[41] *Дневники Я. П. Сапеги...*, op. cit., c. 226–228.

[42] Б. Флоря, *Русское общество в Эпоху Смуты. Смута в России и Потоп в Речи Посполитой...*, op. cit., c. 65–66.

[43] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 33.

Ваза доўга адмаўляўся браць на дзяржаву чужыя даўгі. Толькі калі вайсковыя канфедэраты вярнуліся ў межы ВКЛ, пад ціскам соймікаў кароль прызнаў такую магчымасць. Палепшыў палітычныя пазіцыі сапежынцаў і асабісты канфлікт, які пачаўся паміж каралём і С. Жалкеўскім. У выніку яго польны каронны гетман ў канцы кастрычніка 1610 г. з'ехаў з Крамля праз Смаленск. Ен звез з сабой у палон былога цара Васіля Шуйскага, яго братоў і царскую казну. Разам са сваім гетманам з'ехала шмат караняжаў. Полк караняжаў старасты Хмельніка, што пад Вінніцай, Мікалая Струся (роты Ланцкронскага, Валчкевіча, Каліноўскага) і рэштка гетманскага палка спынілася каля Мажайска. Яшчэ перад ад'ездам „губернатара" С. Жалкеўскага па згодзе з баярамі „старастам" Масквы і кіраўніком гарнізона (ад 5575 да 6583 ваяроў) быў прызначаны А. Гасеўскі[44].

Зімой 1611 г. на Разаньшчыне і верхнім Паволжы пачало ўтварацца першае расійскае паспалітае рушанне (апалчэнне). На чале яго сталі Пракоп Ляпуноў, які прадставіў дваран (земства) поўначы, а поўдзень – данскіх казакоў, узначаліў Іван Заруцкі. Пры падыходзе рушання да Масквы 29.03.1611 г. пачалося паўстанне масквічоў і баі на вуліцах горада. На дапамогу гарнізону прыйшоў полк М. Струся з Мажайска. Увесь наступны тыдзень, выконваючы парады думных баяр і загады каменданта гарнізона, падаўленне бунта суправаджалася выпальваннем маскоўскіх пасадаў[45]. Колькасць нелаяльных уладзе зменьшылася, а тэрыторыя вакол умацаванняў была ачышчана ад драўняных пабудоў, што для доўгатэрміновай абароны было абавязковай умовай. Аднак полымя вынішчыла і запасы харчавання, а масавае рабаванне і гвалт адштурхнулі масквічоў. Выпад палкоў М. Струся і А. Збароўскага разграміў апалчэнцаў А. Прасавецкага, але ўжо праз тыдзень ад пачатку паўстання тры войскі апалчэнцаў, казакоў і васальных цару татарскіх ханаў (агулам каля 100 000) злучыліся пад Масквой. Пазбягаючы бітваў у полі[46], яны пачалі аблогу сваёй сталіцы.

44 T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 62–63.

45 *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 50–53.

46 Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., с. 198–199.

Восенню 1610 г. сапежынцы засталіся асобнай ад гарнізона і каралеўскага войска палявой сілай з нявызначаным статусам, бо кароль цягнуў з іх наймам. Яны працягвалі захоўваць арганізацыйную форму канфедэрацкага кола, а свайго маршалка-палкоўніка іменаваць гетманам. У гэты ж час А. Лісоўскі, дзякуючы пратэкцыі Л. Сапегі, паступіў на службу ВКЛ. Вальны сойм 1611 г. афіцыйна зняў з яго баніцыю, наняў на службу ВКЛ і далучыў зону яго кантроля (Краснае, Завалочча, Вароніч)[47] да ВКЛ[48]. Ад'езд караняжаў вымушаў улады ВКЛ пашыраць выклік на службу іншых небяспечныя ў плане дысцыпліны вайсковыя кантэнгенты. Яшчэ ў прыбочным палку караля, які рушыў з Вільні пад Смаленск у 1609 г., было 300 літоўскіх татар, але ўжо летам наступнага года адбыўся ўсеагульны выклік „татараў і ўсіх зямянаў, якія землі ў тых харуствах набылі" на службу вялікаму князю. У верасні 1611 г. усе сцягі татараў ВКЛ былі скіраваныя пад зверхнасць Я. К. Хадкевіча „ў Маскоўскую зямлю пад Белую" (еланскі сцяг (? уланскі) – Шчасны Якубовіч, наваградскі сцяг – харужы Магамет Давлет Бахметавіч, мурза Барынскі (?), мерэшлянскі сцяг – харужы Ібрагім Завацкі, троцкі сцяг – харужы Хацьбей мурза, віленскі сцяг – харужы Ібрагім Ясіновіч (Асанавіч), гарадзенскі сцяг – харужы Багдан Фурсавіч Улан), а праз год кароль перанакіраваў татар на абарону Полацкага і Віцебскага ваяводства пад каманду А. Лісоўскага[49].

Перад вальным соймам 1611 г., нягледзячы на наяўнасць гарнізона на Крамлі і абаронны буфер ад лісоўчыкаў, полацкі павятовы соймік патрабаваў знайсці асобы, з-за якіх пачалася вайна, каб наказаць, усклаўшы на іх пошук грошай на ваенныя патрэбы, і, адначасова, ён бачыў магчымасці працягу вайны і заключэння міра[50]. Менскі і ашмянскі соймікі звязалі сваю згоду на збор падаткаў з пачаткам мірных

[47] *Памятники смутного времени. Тушинский вор: личность, окружение, время. Документы и материалы*, [в:] *Труды исторического факультета МГУ*, сост., вст. статья и комментарии В. Кузнецова и И. Кулаковой, Москва 2001, серия 1. Исторические источники, № 10, с. 223.

[48] Volumina Legum..., op. cit., p. 25.

[49] BCzart, sign. 2073, №69; НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 66 аб.–67. Лісты татарскім сцягам ВКЛ. 28.09.1611, Вільня.

[50] BN PAN PAU w Krakowie (Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności), rkps. 360, арк. 224.

перамоваў дыпламатычным шляхам[51]. Толькі 27.03.1611 г. кароль паабяцаў Я. П. Сапегу разлічыцца за папярэднюю службу яму і Самазванцу і фармальна наняў яго войска.Назіраючы за адносінамі і магчымасцямі абодвух дзяржаў, увесь наступны год сканфедэраванае сапежынскае войска, лісоўчыкі і іншыя палкі збіралі харчаванне для сябе і залогі на Маскве, чакалі выплаты або ад караля, або ад цара. Яны ваявалі супраць першага расійскага апаўчэння (сакавік-чэрвень 1611 г.), але ня ішлі на генеральныя сражэнні, штурмы баз і сур’езных варожых умацаванняў.

Вясной 1611 г. Я. П. Сапега адышоў з пастояў пад Калугай у ВКЛ, каб месяц адпачыць у сваіх Усвятах, але ўжо ў траўні вярнуўся на службу. Атрымаўшы весткі аб паўстанні ў Маскве, ён рушыў са смаленскага табара на падтрымку сталічнага гарнізона[52]. Паралельна „гетман” веў перамовы з П. Ляпуновым і не дасылаў вестак абкладзеным, аб тым, на чыім баку ён дзейнічае. Стаўшы 17.01.1611 г. асобным лагерам пад Навадзевічым манастыром, ён хоць і разблакаваў горад, але сам не нападаў на лагер апалчэнцаў і забараняў гэта рабіць залозе. У якасці закладнікаў пад перамовы „гетман” даслаў да П. Ляпунова сваіх ротмістраў – Януша Тышкевіча, Пабядзінскага і Подгародыньскага[53]. Генеральнае кола сапежынскай канфедэрацыі выправіла пасольства да караля з патрабаваннем наняць іх на наступныя 2 чвэрці службы. Кароль зацягнуў з адказам. Недачакаўшыся, пасля ваеннага савета Я. П. Сапегі з А. Гасеўскім і А. Збароўскім, праз паўмесяцы пастоя пад сталіцай, каб прымусіць апалчэнне адыйсці ад сталіцы і сабраць харчаванне абаронцам Крамля, сапежынцы выправіліся ў рэйд на тылы ворага[54].

Аднак, скарыстаўшыся з іх адыходу, 31.05.1611 г. апалчэнцы ўзялі Мікулскую вежу, якую бараніла рота Бабоўскага і Млоцкага, і замацаваліся ў Белым горадзе. Залозе дапамагла хітрасць і весткі аб ўзяцці каралём Смаленска 3/13.06.1611 г. Выдатна арыентуючыся ў навінах

[51] Т. Амброзяк, *Отношение литовских сеймиков к Смуте и интервенции Речи Посполитой в Москве*, [в:] *Смута как исторический и социокультурный феномен. Материалы всеросийской научной конференции 22.04.2013*, Москва 2013, с. 182–183.

[52] *Дневники Я. П. Сапеги*..., op. cit., с. 288–290.

[53] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 63.

[54] Ibidem, s. 58–59, *Дневники Я. П. Сапеги*..., op. cit., с. 304–306.

і расейскіх рэаліях, дзе казакі і сяляне-ўцекачы поўдня супрацьстаялі прыгоннікам-земцам поўначы і баярам Масквы, А. Гасеўскі пераканаў аднаго з палонных у сваей змове з кіраўнікам апалчэння П. Ляпуновым, пасля чаго вызваліў вязня. Той „здрадзіў змову баяраў" казакам[55]. 11/22.07.1611 г. данскія казакі выклікалі на кола і забілі П. Ляпунова. Апалчэнне распалася. Казакі І. Заруцкага засталіся пад горадам, але земскія атрады зышлі.

За сярэдзіну ліпеня-жнівень 1611 г. сапежынцы захапілі Аляксандраву Слабаду, заблакавалі Пераяслаўль Залескі і Троіцу. З абложных лагераў выправіліся па правізію чаты пана (Войцэха?) Сумы на Растоў, а (Балтазара) Стравінскага і Стэцкевіча пад Троіцу[56]. Загоншчыкі паспяхова выканалі заданне, але іх метады збору харчавання далёка не заўседы былі дапушчальнымі для рыцарства. Як і ў выпадку з крадзяжамі, гвалтам і абразай рэлігійных пачуццяў мясцовых жаўнерамі гарнізона ў Маскве, загоншчыкі падлягалі вайсковаму суду па законах Рэчы Паспалітай. А яны былі нават больш суворыя, чым маскоўскія. Так, 4 жніўня, выслухаўшы сведкаў (растаўчан і таварышаў-паплечнікаў), канфедэрацкі суд прысудзіў да смерці ротмістра Бедрыцкага, якога абвінавацілі ў разрабаванні растоўскай царквы і катаванні тамашняга святара. Калі абоз і харч сабраліся 6.08.1611 г., сапежынцы вырушылі з Пераялаўля на Маскву[57].

14.08.1611 г. ударам з двух бакоў залогі і палка сапежынцаў Касакоўскага[58] былі занятыя ўсе маскоўскія брамы. Апалчэнцы выйшлі з Белага горада і Навадзевічага манастыру, але засталіся ва ўмацаваных астрогах пад горадам. Назаўтара Я. П. Сапега правеў з І. Руцкім абмен

---

[55] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 65.

[56] Усе яны атрымлівалі разлічэнне ад ВКЛ у скадзе Берасцейскіх канфедэратаў у 1613 г.

[57] *Дневникъ событій, относящихся къ Смутному времени (1603–1613 гг.), извѣстный подъ именемъ исторіи ложнаго Димитрія (Diariusz J. Budziłły)*, [в:] *Русская историческая библиотека*, Спб. 1872, т. 1. *Памятники, относящиеся к Смутному времени*, с. 252–153.

[58] Геранім і Францішак (Франц) Нікадзім Касакоўскія з Польшчы, ротмістры, жанатыя на літвінках, слугі Я. К. Хадкевіча і Валовічаў (K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku*, Warszawa 2019, s. 309, 333).

палоннымі і прыняў пасла з ВКЛ, давераната слугу Л. Сапегі – (Яна) Грыдзіча, які запэўніў у хуткім падыходзе падмацаванняў з Літвы на чале з Я. К. Хадкевічам. Вялікі канцлер ВКЛ у жніўні 1611 г. таксама прапаноўваў падмацаваць „бедакоў на Крамлі" жаўнерамі чарговай інфлянцкай канфедэрацыі, гарматамі і выбранцамі з ВКЛ[59]. План Л. Сапегі ня быў рэалізаваны. Маскоўскія баяры спрабавалі матываваць Я. П. Сапегу на далейшую супрацу і на застаў запазычанасці па аплаце перадалі яму царскія рэгаліі са скарбу: „два рогі адзінарога" і карону[60].

Войска сапежынцаў і залогі бунтавала, але сталічны камендант А. Гасеўскі заявіў на іх патрабаванне жолду ад царскага скарбу за 2 чвэрці службы, што ў маскоўскім скарбе няма грошай. На генеральным коле таварышы пастанавілі „гэтыя 40 000 зл." ці шукаць у скарбе, або „без грошай цярпець і да Польшы ісці". Выбару накірунку маршу спрыяла не толькі грамадзянства часткі жаўнераў, але і тое, што ВКЛ было вынішчана маршамі і канфедэрацыямі. У пачатку верасня 1611 г. з Крамля з'ехала рота Я. Парыцкага і частка сваволньага таварыства, а Казаноўскі, Баркоўскі і Мархоцкі паехалі пасламі на сойм ад канфедэрацкага кола[61].

4 верасня асноўныя сілы першага расейскага апалчэння ізноў заблакавалі гарнізон Масквы. 15.09.1611 г. Я. П. Сапега правёў чарговы канвой з харчаваннем, але захварэў і 15.10.1611 г. памёр на Крамлі. Яго цела здолелі вывезці і, паводле запавета, пахаваць побач з бацькам, у Лейпунскай радавой царкве[62]. Пакуль восенню 1611 г. Я. К. Хадкевіч збіраў харчаванне з ВКЛ у сваіх падняпроўскіх уладаннях Рагачове і Шклове, на мяжы кастрычніка-лі-стапада 1611 г. на Маскве пачаўся голад, а праз месяц сярод нямецкіх наймітаў там былі ўпершыню зафіксаваныя выпадкі канібалізма[63].

10 кастрычніка 1611 г. Я. К. Хадкевіч выйшаў з Масквы да паддзімітраўскай вёскі Рагачова з часткай маскоўскай залогі і разаслаў фуражныя каманды на ўсход і поўнач, да Волгі[64]. Рота (Аляксандра?) Камінскага

[59] BRacz, rkps. 77, №173.

[60] *Дневники Я. П. Сапеги...*, op. cit., c. 296.

[61] Ibidem, c. 314–327.

[62] Х. Граля, *Возрождение из небытия…*, op. cit., c. 47.

[63] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., c. 202.

[64] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 69–70.

19.11.1611 г. ня здолела захапіць знянацку Суздаль. 22.11.1611 г. набег роты Зязюлінскага на Растоў быў адбіты, але 2 снежня полк Будзілы з ротамі Сямашкі, Падгарадынскага і Вярбіцкага занялі паблізкі Угліч. Негледзячы на супрацьдзеянні растоўцаў, яраслаўцаў і апалчэнцаў Прасавецкіх, жаўнеры ВКЛ сабралі правіянт і ў палове снежня, скарыстаўшыся з моцнага марозу, адправілі яго на Маскву[65]. 18.12.1611 г. у Крэмль з боем прабілася яшчэ 200 вазоў і 500 жаўнераў з паўднёвых рэгіёнаў Рэчы Паспалітай і заволжскіх земляў, сабраных Самуэлем Карэцкім[66] і аддзеламі Я. К. Хадкевіча на верхняй Волзе і ВКЛ[67].

Аднак тое, што доўгачаканага „інфлянцкага войска з Літвы" аказалася ўсяго 1500, спрычынілася да краху надзей і шмат хто з абаронцаў пачаў думаць аб новай канфедэрацыі. Рыцарства даслала найбольш прадстаўнічае пасольства да караля (палкоўнікі Казаноўскі і Баркоўскі, ротмістры Мархоцкі і Грычына, паручнікі Вайкоўскі і Шчэдзінскі і 2 таварышы), а так сама сойма і соймікаў з пратэстацыяй на адсутнасць забеспячэння і шантажуючы абяцаннем служыць толькі да 06.01.1612 г.[68]

На Маскве Я. К. Хадкевіч правеў суды, вылучыў з гарнізона экспедыцыйны корпус, а тым 3000 ваяраў, хто застаўся на „мурах сталіцы", павялічыў жолд. Уведзеныя „муравыя" склалі па 20 зл. таварышам і па 15 зл. пахолку за месяц, а не за чвэрць года, як было раней. Маскоўскія баяры запусцілі некаторых таварышаў паглядзець на царскі скарб і заклалі ім, пад гарантыю выплаты заслужанага, царскія шапкі Б. Гадунова і Дзмітрыя I, царскі посах, сядло і „два ці тры рогі адзінарога". Той частцы войска ВКЛ, якой вялікі гетман ВКЛ загадаў на чале з Я. Будзілам ісці зімаваць і збіраць харчаванне на Растоў і вярхі Волгі, даручылі забраць і адкарміць частку конёй гарнізона[69].

---

[65] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 160; *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 71.

[66] С. Карэцкі быў пляменнікам па сястры Я. К. Хадкевіча, яго швагрaмі – С. Валовіч, В. Фрэнсбах, К. Манівід Дарагастайскі, а швагрaм С. Карэцкага – М. Глябовіч, пратэгаваны тым жа гетманам ВКЛ (K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla...*, op. cit., s. 291–293).

[67] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., с. 202.

[68] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 68.

[69] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., с. 200–201; *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 68.

Вырашальнай дапамогі ці грошай у вызначаны тэрмін ад караля не паступіла. Негледзячы на спробы вялікага гетмана ВКЛ асабіста і прыслаўшы свайго кліента – Юзафа Цэклінскага – адгаварыць жаўнераў ад канфедэрацкага кола, 6.01.1612 г. войска Я. К. Хадкевіча з'ехалася ў поле. Замест таго, каб выканаць гетманскі загад і разысціся, сабраныя абралі сваім кіраўніком-палкоўнікам згаданага вышэй гетманскага пасланца, а галоўнакамандуючым (?) – Капыцінскага[70]. Дзеля таго, каб канчаткова абвесціць канфедэрацыю і абраць маршалка, ім трэба было ісці на злучэнне з маскоўскім гарнізонам. Замест афіцыйных, войска абрала сабе новых палкоўнікаў: гетманскі полк – Валента Плаўскага[71]; полк А. Забароўскага – Рыгора Сянькевіча[72], (?) Слаўскага, (?) Касцюшковіча, Балінскага[73]; полк М. Струся – Тэадора Вароніча[74]; Л. Вэйгера – Багдашэўскага[75]; полк М. Казаноўскага – Людвіка Панятоўскага[76].

14.01.1612 г. жаўнеры палкоў А. Збароўскага, С. Жалкеўскага, М. Казаноўскага, Л. Вэйгера, А. Гасеўскага і шэрагу іншых дайшлі да сталіцы з прыпасамі і ўжо афіцыйна абвесцілі ў Маскве „Сталічную" канфедэрацыю. Абраныя раней палкоўнікі і маршалак Юзэф Цэклінскі засталіся на кіруючых пасадах, але кола прыставіла да іх яшчэ 7 жаўнерскіх дэпутатаў-канцыляраў (Яркоўскі, Сулішоўскі, Свежынскі, Вуякоўскі, Трылятоўскі, Сняжоцкі і сын А. Гасеўскага – Сымон). Каб выратаваць сітуацыю, Я. К. Хадкевіч абяцаў тым жаўнерам, якія засталіся на Маскве,

[70] Род у ваколіцах Пшэмышлю (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1910, t. VII, s. 199–200).

[71] Род гербу Плятэр у Слонімскім павеце ці герба Радван у Варшаве (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1917, t. XIV, s. 91–92).

[72] Яраш, ротмістр і войскі мазырскі, або Грыгоры Сянкевіч, давераны слуга і ротмістр Я. К. Хадкевіча (K. Żojdź, *Wszyscy ludzie króla…*, op. cit., s. 303, 305, 320–321).

[73] Род у Лідскім і Ковенскім павеце ў 1700 г. (K. Niesiecki, *Herbarz polsk*i, Lipsk 1840, t. II, s. 379).

[74] Кіеўскае ваяводства, род меў уладанні каля Житоміра, Валыні і Ашмянскім павеце (K. Niesiecki, *Herbarz polsk*i, Lipsk 1842, t. IX, c. 428).

[75] Род на Валыні (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1904, t. I, s. 269).

[76] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*..., op. cit., s. 72; Панятоўскія род разгалінаваны на Падляшшы, Люблінгшчыне і Берасцейшчыне (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1917, t. XIV, s. 223–232).

замяніць іх 14 сакавіка 1612 г., а яны патрабавалі, каб з імі цалкам разлічыліся да 24.06.1612 г., пагражаючы акупаваць каралеўшчыны ў Рэчы Паспалітай[77].

Два тыдні адбыўшы ў Маскве, вялікі гетман ВКЛ здолеў дамовіцца аб узмацненні гарнізона адзеламі былых сапежынцаў. 27.01.1612 г. гэты добра забяспечаны полк В. Будзілы і Э. Стравінскага ў 1500 ваяроў з абозам, здолеў прарвацца ў Маскву з Паволжжа. Да сакавіка 1612 г. на Крамлі, Белым і Кітай-горадзе знаходзілася 6392 жаўнеры з Рэчы Паспалітай (палкі Будзілы, Гасеўскага, Збароўскага, Казаноўскага, Жалкеўскага, Вейгера)[78]. Палкі Я. К. Хадкевіча і М. Струся ў канцы студзеня выйшлі збіраць харч да Ржэва і Старыцы. Канфедэраты чарговы раз запатрабавалі ад Жыгімонта Вазы выплаты запазычаннасці па жолдзе за службу не толькі Рэчы Паспалітай, але і Ілжэдзмітрыю ІІ. 14.03.1612 г. нагадаць вялікаму гетману ВКЛ абяцанне забраць гарнізон выправіўся палкоўнік Касцюшкоўскі і С. Маскевіч. Вясна 1612 г. прайшла ў чаканні адказаў і збору рэсурсаў абодвума варагуючымі бакамі.

27 траўня сталічныя канфедэраты на чале з А. Гасеўскім няўдала паспрабавалі самастойна атагнаць казакоў апалчэнцаў І. Заруцкага ад сталіцы. 15.06.1612 г. Я. К. Хадкевіч з абозам і 2500 ваяроў (17 рот вершнікаў, 4 запарожскіх казакоў 2 роты пяхоты) дабраўся да Масквы і пачаў баі з апалчэнцамі на маскоўскіх прадмесцях. Пасля ўдара з горада палка А. Збароўскага ўдалося стварыць калідор і 22 чэрвеня правесці абоз і купцоў у сталіцу. Пад ціскам Я. К. Хадкевіча, нягледзячы на пачатковае нежаданне, камендант А. Гасеўскі 27.06.1612 г. перадаў уладу над гарнізонам М. Струсю, свайму суперніку ў гонцы за ласку каралевіча Уладзіслава Вазы[79]. У гарнізоне засталіся запарожцы, Аляксандр Каліноўскі і Сымон Харлінскі[80], аднак перамовы з каралем у жніўні і другім расейскім апалчэннем у верасні 1612 г. ад імя залогі правод-

[77] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 73; T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 175.

[78] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 176–177.

[79] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., c. 202.

[80] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 182–183; С. Харлінскі – ротмістр асеў на Літве, род з Любельшчыны і Валыні (S. Uruski, *Rodzina. Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1905, t. II, s. 151).

зілі не караняжы, а Восіп Будзіла і Эразм Стравінскі з літоўскай часткі гарнізона[81]. У той жа дзень, 27.06.1612 г., палкі Гасеўскага, Вэйгера, кароннага і літоўскага гетманаў з'ехалі з Масквы ў накірунку ВКЛ. Па дарозе новыя канфедэраты скантактаваліся з сапежынцамі, якія сталі ў Берасці, Гародні і Магілёве яшчэ зімой. Яны дамовіліся аб узаемападтрымцы, калі кароль надумае распраўіцца з імі, як са свавольнікамі, як пагражаў у звароце ад 28 красавіка 1612[82].

Тыя ваяры, што засталіся, ізноў апынуліся ў аблозе. Некалькі вазоў збожжа здолеў падвёзці 25 ліпеня пад аховай запарожцаў Якуб Бабоўскі. Але абаронцам дасталося ўсяго „па шапцы жыта". Ужо 27.07.1612 г. запарожцы разам палком Збароўскага зышлі з Масквы[83]. У апошні перыяд існавання залогу пад кіраўніцтвам М. Струся і В. Будзілы складала ад 1500 да 6000 чалавек з ВКЛ, Кароны і Маскоўскай дзяржавы ўключна з будучым царом – Міхаілам Раманавым. Менавіта гэты склад маскоўскага гарнізона патрапіў у трохмесячную поўную блакаду, калі ў пачатку жніўня пад горад падышлі асноўныя сілы другога маскоўскага паспалітага рушання К. Мініна і Д. Пажарскага. Другое расейскае апаўчэнне паглынула рэшткі першага, а яго кіраўнік І. Заруцкі 7.08.1612 г. ўцек у Калугу.

Спроба Я. К. Хадкевіча 23–25.08.1612 г. (1–3.09.1612 г.) яшчэ раз прабіцца вуліцамі Масквы ў Крэмль скончылася правалам. Кавалерыю яго арміі складалі 1427 вершнікаў збольшага інфлянцкага войска ВКЛ (роты Томаша Дамбровы (153 гусарскіх коні), Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла (112), Грыгора Глябовіча (93), Януша Кішкі (85), Самуэля Валовіча (63); інфлянскія рэйтары (Вальтэра) Плятэнберга (71) і Мікалая Корфа (61); татары ВКЛ (Царэвіча (100), Акаловіча (100), Багдана (100); з Кароны паходзілі гусарскія роты – С. Карэцкага (50), А. Збароўскага (150), С. Канецпольскага (67–89) 2 казацкія па 100 коні Васічынскага і Я. Бабоўскага). Дзеля гарадскіх баёў у яго арміі была пяхота: 400 гетманскай і Фабіяна Руцкага, 800 венгерскай Ш. Невяроўскага, 400 польскай Пятра

[81] *Дневникъ событій, относящихся къ Смутному времени (1603–1613 гг)...*, op. cit., с. 326–338, 341–346.

[82] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 78.

[83] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 183, 191.

Граеўскага, 200 нямецкай А. Млоцкага і каля 6000 запарожскіх казакоў Андрэя Налівайкі[84].

Пасля двух дзен бесперапынных цяжкіх штурмаў, 3 верасня вялікі гетман ВКЛ быў вымушаны спыніцца ў 200 метрах ад брамы Крамля і адысці, згубіўшы 400 вазоў з харчаваннем. Некаторыя сучаснікі-маралісты абвінавачвалі каменданта Крамля М. Струся (звязанага з Пацкімі) у адмысловай пасіўнасці з-за зайдрасці літвінам, якая прывяла да гібелі і палону 1500 (!) жаўнераў Я. К. Хадкевіча і правалу ўсей аперацыі[85]. Больш таго, калі Ш. Невяроўскі прабіўся з 600 вянгерскіх і нямецкіх пехацінцаў на Крэмль, але без абоза, яны толькі падхлыснулі голад. Пасля чаго Д. Пажарскі, які этнічны склад абкладзенай залогі класіфікаваў як „русінаў, літвінаў і немцаў", засведчыў: „літва" пачала есці катоў, псоў і людзей[86].

Пачакаўшы пакуль голад стане нясцерпным, Д. Пажарскі 25.09.1612 г. запрапанаваў В. Будзілу і Э. Стравінскаму скінуць М. Струся і адчыніць брамы. Літвіны засталіся вернымі прысязе. Калі ж кн. Пажарскі і Трубяцкі звярнуліся з аналагічнай прапановай да каменданта Вязьмы Паўла Руцкога, той адказаў, што ўжо канваяваў абранага імі цара (В. Шуйскага) ў палон, а новага, не давозячы – павесіць[87]. Нягледзячы на цвердасць духа, у пачатку кастрычніка сітуацыя абложаных стала катастрафічнай. Іх даканаў голад, а апалчэнцы падвязлі бурачую артылерыю пад муры. Абаронцы адбілі шэраг штурмаў, але ўсё ж былі вымушаны здаць Кітай-горад 22.10.1612 г. Камандаванне пачало перамовы аб капітуляцыі.

Асноўную частку маскоўскага баярства разам з М. Раманавым выпусцілі з абложанай Масквы напярэдадні здачы. Іх адразу ўвялі падалей ад чэрні пад аховай дружыны Пажарскага. Пад гарантыю жыцця абаронцам 27 кастрычніка/6 лістапада 1612 г. Крэмль адчыніў брамы і залога вышла на літасць пераможцаў. Большасць капітуляваўшых

[84] Ibidem, s. 204–207.

[85] Ibidem, s. 252.

[86] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)...*, op. cit., c. 203; T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 267.

[87] *Дневникъ событій, относящихся къ Смутному времени (1603–1613 гг.)...*, op. cit., c. 326–338; T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 268–271.

апалчэнцы перабілі. Кагосці адразу, як пераважную частку палка М. Струся, кагасці ў палоне, як жаўнераў рот Стравінскага ва Ундоры і Будзілы ў Галічы[88].

Пад час першага абмену ваеннапалоннымі пасля заключэння перамір'я, у лютым 1619 г., расіяне вярнулі ў Рэч Паспалітую 190 былых жаўнераў, рамеснікаў, іх жонак і дзяцей на чале з М. Струсём. Кіравалі абменам А. Гасеўскі і камендант Смаленска, брат Эразма і ўдзельнік бітвы пад Кірхгольмам[89] – Балтазар Стравінскі. У адрозненні ад першай групы, якая ўтрымлівалася ў Маскве, другую частку вярталі са ссылкі па расейскіх правінцыях (Ніжні Ноўгарад (В. Будзіла, Э. Стравінскі, Альберт Падбільскі), Яраслаўль (ротмістры Каліноўскага, Якуб Хоцімскі), Балахна (А. Каліноўскі, Валынец). Толькі ў траўні 1619 г. у Вязьму прыбыла другая партыя з 96 вязняў на чале з В. Будзілам і Э. Стравінскім (41 шляхціча і 49 баявых халопы і 6 цывільных). Абмен адбыўся 10.06.1619 г. каля рэчкі Палянаўкі. З прыблізна 1500 вояроў крамлёўскай залогі апошняй ратацыі дамоў вярнулася 286 чалавек. Праз некалькі дзен было выпушчана яшчэ некалькі дзесяткаў палонных разам з А. Млоцкім[90].

Некаторыя з палонных інтэграваліся ў маскоўскае грамадства, як, напрыклад 38 „ніжагародскай літвы", якія ўдзельнічалі ў захопе І. Заруцкага і Марыны Мнішак з сынам на Яіку летам 1614 г. – не вярнуліся на радзіму[91].

Ведаючы аб катастрафічным стане залогі на Крамлі, у верасні 1612 г. Жыгімонт Ваза асабіста рушыў з Оршы да Смаленска. Стымулюючы жаўнерства, ен выдаў юргельды заслужаным у Інфлянтах былым канфедэратам, якія працягвалі ваяваць у Маскве (Адаму Кендзерскаму і Станіславу Керсноўскаму). Больш таго, наняў 100 конную гусарскую роту Мікалая Вільчкоўскага прыпаведнымі лістамі на рэкордныя стаўкі ў 30 зл. за чвэрць і 100 зл. кухенных і 100 пяцігорцаў Станіслава

[88] Ibidem, s. 282.

[89] НГАБ, КМФ-18, спр. 86. воп. 1, арк. 663.

[90] T. Bohun, *Wymiana Jeńców w Ramach Rozejmu Dywilińskiego*, „Вестник *Волгоградского государственного университета. История. Регионоведение. Международные отношения*", Волгоград 2019, т. 24, серия 4, № 2, с. 177, 180–181.

[91] А. Малов, *Выходцы из Речи Посполитой...*, op. cit, с. 233–234.

Багушэўскага за 24 зл., а таксама вызваліў мсціслаўцаў ад выстаўлення выбранцоў і дазволіў падскарбію ВКЛ дзеля разліку з войскам шукаць любых крэдытораў[92]. Яму ўдалося пераканаць жаўнераў не завязваць новую канфедэрацыю. Калі кароль 9.10.1612 г. прыбыў у Смаленск з 4000 ваяроў да іх далучылася яшчэ 1500 кавалерыі і пяхоты. Не чакаючы на падыход абяцаных 7500 драбаў, кароль рушыў праз Вязьму на ратаванне Маскоўскага гарнізона[93]. Яны не паспелі.

У канцы лістапада 1612 г. войска стала на зіму ў Вязьме. Даведаўшыся аб жаданні некаторых баяр на Земскім саборы захаваць вернасць і царскі тытул за яго сынам Уладзіславам, Жыгімонт Ваза даслаў у Маскву на перамовы з Мініным і Пажарскім дэлегацыю з двума маскоўскімі баярамі, А. Збароўскім і А. Млоцкім, пад аховай 1200 жаўнераў. Паслы асабіста пераканаліся ў дарэмнасці царскіх надзей каралевіча, наслухаліся абразаў, паўтары гадзіны біліся з масквічамі і вярнуліся ані з чым[94].

Прадстаўнікі Польскага каралеўства, якія з'ехалі з Масквы зімой-вясной 1612 г., размясціліся на лежах у Рускім, Валынскім і Бэлзкім ваяводствах[95]. „Сапежынцы" пад маршалкоўствам Яна Заліўскага ў снежні 1612 г. праслужылі даўжэй за „сталічных" і адмовіліся да іх далучацца. Яны прыйшлі ў Берасцейскую эканомію і папрасілі забеспячэнне не толькі з ВКЛ, але і ад Княжаскай Прусіі[96]. Берасцейскія канфедэраты звярнуліся да прускага князя, каб яго жаўнеры не нападалі на іх, а Ян Жыгімонт Гагенцолерн у адказ папрасіў іх не ўязджаць у край і паабяцаў выдаць ім забеспячэнне, фактычны выкуп, грашыма[97].

---

[92] НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 155, 155аб, 175, 176, 177, 189–189аб.

[93] T. Bohun, *Moskwa 1612*, op. cit., s. 269.

[94] Т. Бохун, *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)*..., op. cit., с. 209.

[95] Полк пана Харлінскага – стаў у Хэлме, Красным ставе, Дубне, Яворове і яшчэ 5 мястэчках вакол, полк пп. Сенковічаў (Сенькевічаў) – вакол Бэлза, полк Касюшковічаў заняў Ковель, Уладзімір, Городлю і яшчэ 4 лежа, полк Вароніча – Луцк, Крэменец і 2, Полк Слаўскага – Стрый, Дарогобыч і ваколіцы, полк Вейгера – Вішню, стары горад Самбор і ваколіцу, полк Панятоўскага – Перамышль, Санок і ваколіцы (Latvijas Valsts vēstures arhīva (LVVA), f. 673-1-1224, арк. 79).

[96] GStA XX HA Ostpr., fol. №818, арк. 13; Ibidem, арк. 18.

[97] GStA, XX HA Ostpr., fol. №818, арк. 13.

Пасля ўзяцця Смаленска Жыгімонт Ваза выдаў прывілей, які далучыў горад да Польскай Кароны. У ВКЛ гэтага не чакалі, таму ў 1611 г. толькі віленскі соймік запатрабаваў вярнуць страчаныя стагоддзе таму Смаленскае і Северскае ваяводствы ВКЛ, а Полацкае і Менскае ваяводства абмежавалася просьбай вярнуць уласнасць былым гаспадарам, але пакараць вінаватых у развязванні вайны[98]. Зыходзячы з аб'ектыўных магчымасцяў, уцягнутасці ВКЛ ў абарону межаў ад Інфлянтаў да Гомеля і спробу вярнуць Маскву, большасць войска вакол Смаленска ў 1611–1612 гг. складалі роты караняжаў пад кіраўніцтвам брацлаўскага ваяводы Якуба Патоцкага. Паколькі спроба вярнуць Маскву восенню 1612 праваліласа, Патоцкія так і ня атрымалі ад караля гетманскай булавы, а войска сваечасовай аплаты жолда – пачаліся бунты смаленскага войска. На вайсковай нарадзе 6.01.1613 г. у Смаленску Жыгімонт Ваза асабіста пераканаўся ў рашучасці караняжаў. Карыстаючыся крызісам адносінаў з палякамі, Я. К. Хадкевіч і Л. Сапега прапанавалі перадаць горад пад адміністрацыю і абарону ВКЛ, якую б падмацавала 1500 інфлянцка-нямецкай пяхоты Тэадора Дэнхофа. Далейшы ход падзей паказвае, што кароль прыняў прапанову ВКЛ. Калі Я. Патоцкі раптам памёр, караняжы сканфедэраваліся і пад маршалкоўствам Збігнева Сільніцкага ў траўні 1613 г. зышлі з пад Смаленска[99] на Быдгашч, Каралеўскую і Княжаскую Прусію. З імі разлічваўся выключна скарб Кароны. Шмат дзе яны прыехалі на месца „берасцейскіх" канфедэратаў, якія дагэтуль збіралі стацыю на поўначы Польшчы[100].

Верагодна, інтрыгай з перадачай Смаленшчыны кароль шукаў рэсурсы на правядзенне вайны, такім чынам стымулюючы караняжаў і літвінаў актыўней удзельнічаць у дзяржаўных выдатках. Разам з тым, калі памёр былы смаленскі ваявода Петр Манівід Дарагастайскі, кароль праз пару тыдняў пасля ўзяцця Смаленска, яшчэ ў жніўні 1611 г., прызначыў новым ваяводам Мікалая Глябовіча[101].

[98] BN PAN PAU w Krakowie, rkps. 365, арк. 41, арк. 49, арк. 52.

[99] A. Przepiórka, *Liczebność i organizacja załogi Smoleńska w latach 1613–1618*, „Res Historica" 2024, t. 57, s. 804–805.

[100] GStA, XX HA Ostpr., fol. №819, арк. 51.

[101] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy*, *Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie. XIV–XVIII wiek*, Warszawa 2003, t. IV, s. 216.

Калі стала відавочна, што караняжы ня будуць укладацца ў абарону, перад вальным соймам 1613 г. магнатэрыя ВКЛ арганізавала палітычную кампанію сярод сваёй шляхты, у выніку якой усе вядомыя інструкцыі павятовых соймікаў ВКЛ, паўтараючы адну і тую ж фразу, запатрабавалі вярнуць Смаленшчыну і Севершчыну „як член да цела" да ВКЛ і на пасады там прызначаць выключна літвінаў. Выкананне гэтага патрабавання ставілася ўмовай падтрымкі далейшай вайны з Масквой, на якую менскі, ашмянскі, віленскі, троцкі, вількамірскі соймікі ў цэлым пагаджаліся. Менскі соймік працягваў настойваць на завяршэнні вайны перамовамі, а вількамірскі і ашмянскі – знайсці і судзіць яе завадатараў[102].

Дзякуючы актыўнай пазіцыі літвінскай шляхты і намаганням Л. Сапегі, Вальны сойм 1613 г. абвесціў Смаленскае ваяводства частай ВКЛ[103]. Сойм прызначыў камісію дзеля рэвізіі тамашніх замкаў на чале з мсціслаўскім кашталянам Канстанцінам Галоўчынскім. Апроч старшыні ў яе склад увайшлі: пісар ВКЛ Ян Друцкі Саколінскі, староста цеханавецкі Ян Падорскі, староста аршанскі Андрэй Сапега, харужы ленчыцкі Станіслаў Вітоўскі, скарбовы пісар ВКЛ Павел Якімавіч Галаўня, харужы полацкі Ян Корсак Галубіцкі, каралеўскі сакратар Ян Рыдзіцкі. Сойм загадаў палякам вярнуць зброю і прыпасы, якія тыя маглі пабраць са Смаленшчыны, зыходзячы дамоў, і ўсклаў далейшае забеспячэнне ўсіх патрэбаў іх абароны на падскарбія і вялікага гетмана ВКЛ[104]. 14–17.04.1613 г. Аляксандр Каменскі быў прызначаны капітанам 200 пешцаў на Смаленск, Георгі Валуеў на Невелі, А. Лісоўскі – на Завалоччы[105]. Больш таго, на наступны дзень кароль запатрабаваў ад Гераніма Ціханавецкага, каталіцкіх рад і мяшчан горада Смаленска, каб ніякіх шкод „народу рускаму рэлігіі грэцкай" не рабілі, а гвалтаўнікам права выпісваліся глейты і дзейнічалі працэдуры „па праве паспалітым, у законе прапісаныя". Больш таго, смаленскім камісарам на чале

[102] Т. Амброзяк, *Граница между Речью Посполитой и Московским государством в выступлениях литовских сеймиков в первой половине XVII в.*, „Метаморфозы истории" 2022, №19, s. 13–14; Т. Амброзяк, *Отношение литовских сеймиков...*, op. cit., s. 184.

[103] LMAVB, f. 9–431, арк. 158.

[104] VL, t.III, s. 95–97.

[105] НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 217–219.

з К. Галоўчынскім было загадана знайсці кампенсацыю ўдзельнікам смаленскай выправы – маскоўцам Івану, Даніле, Кірылу Міхайлавічам і Грыгорыю Хрыпуновым, якім „рыцарства заняло маёнткі”[106].

Кіраўніцтва абаронай Смаленска кароль даручыў Я. К. Хадкевічу, а ў яго адсутнасць ваяводзе смаленскаму М. Глябовічу. На практыцы вялікі гетман ВКЛ разам з А. Гасеўскім каардынаваў палявую армію, забеспячэннем цверджы у 1613–1618 г. займаўся Аляксандр Сапега, які арганізоўваў канвоі і абозы з харчаваннем, ен жа з падаткаў аршанскага павета, М. Глябовіч, Юры Шчуцкі, Ян Такарскі, пазней Януш Кішка, праплочвалі каля 1500 жаўнераў, якія, не атрымаўшы ад скарбу сродкаў нават на латанне штурмавых праломаў у мурах, вытрымалі аблогі і захавалі Смаленск ВКЛ[107].

29.07.1613 г. камісары ад Польскай Кароны зафіксавалі патрабаванні жаўнераў „Сталічнай” вайсковай канфедэрацыі па ўзнагародзе за службу ад 6 студзеня 1610 да 6 ліпеня 1612 г. (10 чвэрцяў года да выхада з Масквы плюс 11 „чвэрць прыбышовая”, 12-я дароўная за Клушынскую перамогу). Жаўнеры прасілі лічыць грошы, ўзятыя з маскоўскага скарба, „кармавымі”, а не „жолдам”, то бок ізноў заплаціць ім за першых 6 чвэрцяў службы (6.01.1610 – 6.08.1611) ўжо са скарбу Кароны, хаця са 1 студзеня 1612 г. камісары лічылі іх паспраўаздачнымі вялікаму гетману літоўскаму. Больш таго, прасілі выплаціць ім прэміяльныя „дароўныя” чвэрці: 12-ю за Клушынскую перамогу (194351 флорынаў) і 13-ю „царскую”, на якую, праўда, не пагаджаўся Жыгімонт Ваза[108].

---

[106] НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 223–224.

[107] A. Przepiórka, *Liczebność i organizacja załogi Smoleńska w latach 1613–1618…*, op. cit, s. 807–824.

[108] „Першая чвэрць 6.01.1610–6.04.1610 – 192515 зл. полк Збароўскага 2 чвэрць (чв.) 6.04.1610–6.07.1610, 3 чв. – 6.08–6.10.1610, 4 чв. – 6.10.1610–6.01.1611, 5 чв. – 6.01.1611–6.04.1611 з казны маскоўскай узялі, але хочуць каб ім ізноў заплацілі, бо тое што ўзялі сабе ў кармавыя пенёндзы запісваюць, 6 чвэрць (6.04.11–6.08.1611) – 201457 тыя таксама ўзялі з казны маскоўскай і не прызнаюцца, кажуць іх сабе ў кармавыя грошы палічыць, 7 чв. (6.07–6.10.1611) – 203 716, 8 чв. (6.10.11–6.01.612) – 194968, калі ўзнялі канфедэрацыю. 9 «чвэрць муровая» (6.01.1612–6.04.1612) тым, што засталіся ў сталіцы за асекурацыяй (пацверджаннем) пана гетмана вялікага літоўскага 83369, 10 «чвэрць муровая» па той жа асекурацыі акта 6.04–6.07.1612 па выхадзе са сталіцы 82792. 11 «чвэрць прыбышова», бо сабе лічаць кожную чвэрць па 12 нядзель. Разам

Максімальную колькасць ваяроў, якія ўдзельнічалі ў вайне 1609–1612 г., падае „Сумарыюш войска сталічнага Маскоўскага”: 75 047 ваяроў (67 506 гусараў, 2 981 пяцігорцаў, 4 560 казакоў) з аплатай на 2 835 853/20 зл.[109]. Іншую агульную колькасць ваяроў – удзельнікаў ваенных кампаній з Кароны і Літвы ў Маскве – даюць львоўскія камісары, якія на ўзгаданую 13 чвэрць фіксуюць 3 269 гусар, 396 пяцігорцаў і 26 казакоў з Польскага каралеўства (у спісе адсутнічаюць нізавыя казакі), а з ВКЛ у берасцейскіх сапежынцах налічваюць 4 397 коні гусар, пяцігорцаў, казакоў[110]. Канфедэрацкае кола „сапежынцаў” у Берасці увосень складалі 12 ротаў з ВКЛ і Кароны[111], поўны разлік з якімі адбыўся раней за „сталічных” – 1.11.1613 г. С. Маскевіч гаворыць аб 7000 вершнікаў і столькі ж пяхоты пад Львовам і Берасцем[112].

Афіцыйна канфедэрацыі войска ВКЛ павінны былі стаяць ў эканоміях на землях ВКЛ, але частка рот, каб паслабіць ціск на ВКЛ і заняць яшчэ не разрабаваныя землі, заходзілі в Карону і Прусію ці абіралі каронных таварышаў у маршалкі і палкоўнікі. Апроч таго, грамадзяне ВКЛ, кшталту С. Маскевіча, служылі ў каронных ротах, а дзеля выканання баявых задач і выгоды маглі пераходзіць паміж ротамі і палкамі. Адпаведна з наяўнымі крыніцамі можам з упэўненасцю казаць аб прысутнасці грамадзян ВКЛ ў ротах „сталічных” канфедэратаў – караняжаў Я. Парыцкага, А. Збароўскага, Л. Вэйгера, Р. Ружынскага, Л. Панятоўскага, і літвінаў – Касцюшковічаў (Касцюшак), Я. Скуміна Тышкевіча, Ф. Руцкага, А. Млоцкага, М. Вілямоўскага, А. Гасеўскага[113]. Паводле справаздачы падскарбія ВКЛ Я. Валовіча сойму, 1613 г. скарб ВКЛ выплаціў „сталічным” канфедэратам

191831. 12 чвэрць дароўная за выйграную Клушынскую бітву – 194351, 13 чвэрць «Царская»... трэба яшчэ заплаціць войску 2 300 000 сапежынцам: гусарам, пяцігорцам і казакам 4397 коні 927 812” (LVVA 673-1-1224, арк. 78–79).

[109] LMAVB, f. 17–178, арк. 5–6.

[110] LVVA 673-1-1224, арк. 78–79.

[111] В. Якубаў, *Удзел Грамадзян ВКЛ у войску II Ілжэдзмітрыя 1608–1610 г.…*, op. cit., s. 43–44.

[112] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 85.

[113] LVVA 673-1-1224, арк. 78–79.

833 252,25 зл.[114] У выніку рашэнняў вальнага сойму 1613 г. падскарбі ВКЛ мусіў давезці на разлік з львоўскімі канфедэратамі 280 000 зл. з Вільні, а польскі яшчэ 80 000[115]. Дадатковай узнагародай канфедэратам сталі ўзятыя ў залог выплаты „муровага" царскія клейноты. Паколькі ні кароль, ні Брандэнбургскі князь, ні імператар, ні гданьчане не пажадалі іх купіць, жаўнеры разламалі каштоўнасці на часткі і падзялілі, толькі царскі посах цалкам дастаўся А. Гасеўскаму і С. Дунікоўскаму[116]. Разлік з львоўскімі канфедэратамі і спаленне акта сталічнай канфедэрацыі адбыўся 8.04.1614 г.

Увесь гэты час насельніцтва ВКЛ рабавалі ня так маскоўскія рэйды, як дэзерціры, бандыты і канфедэраты з уласнага і кароннага войска[117]. У 1611–1612 гг. запарожскія казакі сплюндравалі ваколіцы Ружанаў, Слоніма, Блудна, Магілева, Браслава, Іказьні і двойчы Слуцка[118]. Па прычыне панесеных шкод кароль вызваліў сялян магілеўскай эканоміі ад чынша і дзякла[119], а віленская канвакацыя 1614 г. папрасіла сойм і караля ня браць з Я. Радзівіла, з-за вынішчэнняў у Слуцкім княстве, 5 валочных, ухваленых у 1613 г., і кампенсаваць менскаму харужаму Яну Гладкаму за спаленыя масквой пад Дуброўнам маёнткі[120].

Напады запарожцаў паўтаралася да 1614 г., калі казацкія загоны пагражалі Магілёву і Менску, а Я. К. Хадкевіч граміў іх аж пад Навагрудкам і Пінскам. Дзеля абароны ад свавольнікаў, казакоў і маскоўцаў вальны сойм 1613 г. абвесціў аб наборы павятовага жаўнера з традыцыйным для ВКЛ жолдам ў 18 зл. для гусар, 15 зл. для казакоў і татараў ВКЛ на чвэрць[121]. Віленскія канвакацыйныя з'езды 1613–1615 гг. пайшлі яшчэ далей: абвесцілі надзвычайныя падаткі і зборы дзеля разліку з інфлянцкімі, берасцейскімі, сталічнымі, аршанскімі канфедэратамі і папаўнення войска ВКЛ.

---

[114] Российская национальная библиотека (РНБ), ф. 971, воп. 2, аўт. 63/2, арк. 39; LVVA 673-1-1224, арк. 78.

[115] Volumina legum t. III, op. cit., p. 119.

[116] *Pamiętniki Samuela Maskiewicza*, op. cit., s. 92–93.

[117] AGAD, AR II, № 613.

[118] LMAVB, f. 9–431, арк. 154, 156, 157.

[119] НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 171.

[120] *Akta zjazdów stanów...*, op. cit., c. 195, 197.

[121] VL, t. III, s. 122.

Мала таго, што збор сродкаў на разлік з жаўнерамі быў павольным працэсам, дык і самі канфедэраты стваралі праблемы з іх канцэнтрацыяй у скарбе, забіраючы грошы непасрэдна з рук дзяржаўныхураднікаў і трымальнікаў пасад. Летам 1613 г. генеральнае кола берасцейскай канфедэрацыі даслала сваіх таварышаў Яна Парыцкага і Яна Лазоўскага ў Вільню, каб тыя канфіскавалі грошы з прыбыткаў ад мытаў у арандатараў „віленскай каморы і ўсіх прыкаморкаў да яе належачых". Жаўнеры спасылаліся на пастановы сойма і заклікалі скарбнікаў, каморнікаў і іх слуг „паводзіць сябе спакойна"[122]. Але найбольш скандальны выпадак адбыўся тым жа летам 1613 г. „Інфлянцкія" жаўнеры прыехалі на полацкую мытню і канфіскавалі ў залік „заслужонага" грошы, сабраныя тут дзеля выплаты ротам А. Лісоўскага, якія ў гэты час з базы ў Завалоччы абаранялі поўнач ВКЛ ад нападаў масквы і шведаў[123].

Выбрык кафедэратаў ледзьве не прывёў да агалення паўночнай мяжы ВКЛ, бо без забеспячэння і заробку лісоўчыкі збіраліся зыйсці з тэатру баявых дзеянняў. З імі ўдалося дамовіцца, але ўсё адно яны перабазаваліся поўднёвей, за Воршу, дзе па запрашэнні Я. К. Хадкевіча ўжо сталі роты палка А. Збароўскага. На поўначы ВКЛ засталіся роты Фабіяна Руцкага ў Гарадку і Габрыэля Тупальскага. Хаця частку свайго заслужанага гэтыя „збароўцы" атрымалі на Маскве ад царскага скарбу і з мясцовых падаткаў у Аршанскім павеце, канчаткова з імі разлічыліся камісары ВКЛ у Менску 18.03.1614 г.[124]

Ухвалы віленскіх канвакацыі 1613–1614 гг. і карэспандэнцыя пацвярджаюць, што арганізаваць лініі абароны ВКЛ дзяржаве дапамаглі прыватныя асобы. 23.02.1612 г. Жыгімонт Ваза „Старадуб з уездам паручыў у заведванне і абарону" Самуэлю Зяновічу[125]. Ва ўмовах пустога дзяржаўнага скарбу, маскоўскіх і казацкіх набегаў восенню 1613 г. Андрэй Пукель прывёз грошы ад Я. К. Хадкевіча да „жаўнераў у Воршу"[126]. Атрыманыя грошы „аршанцы" прапілі, але засталіся на месцы. Горш

[122] BRacz. Rkps. 75, арк. 5.

[123] *BN PAN PAU w Krakowie, rkps. 363, арк. 29.*

[124] Тупальскі у гэтай справаздачы безіменны і названы нябожчыкам, але ў 1616 полк Габрыэля Тупальскага разаб'юць і пакараюць за бандытызм сілы падчашага ВКЛ Я. Радзівіла і ротмістра Я. Сянкевіча (BRacz, rkps. 75, арк. 27–32).

[125] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie. XIV–XVIII wiek*, Warszawa 2003, t. IV, s. 308.

[126] LMAVB, f. 139–366, арк. 5.

было на Полаччыне. Там шмат ліха нарабіў полк Івашкоўскага, але як толькі ён адышоў на лежа ў Копысі, на каталіцкае Ражаство 1614 г. масква папаліла вёскі Сапегаў і Корсакаў у Падзвінні (Раманаў, Шышоў, Байкова, Андрэйкава, Бешанковічы, Чашнікі і інш.). Адначасова царскія ваяводы зрабілі рэйд пад Гомель і Буды Палявыя, а запарожцы парабавалі сялян аж да Чачэрска. Таму ў студзені 1614 г. той жа слуга гетмана ВКЛ А. Пукель, абараняючы Падняпроўскія ўладанні патрона, запрасіў роты „інфлянцаў" (Мікалая) Корфа на лежа ў Баркулабава пад Магілёў, а (Крыштофа) Роса з Любашан на ўзмацненне роты Акаловіча ў Быхаў[127].

У красавіку 1614 г. татары ВКЛ, роты вялікага маршалка ВКЛ К. Манівід Дарагастайскага, былыя берасцейскія і гарадзенскія канфедэраты з ВКЛ пайшлі на Маскву праз Княжаскую Прусію, атрымліваючы забеспячэнне дзеля пахода, але дапускаючы шматлікія злаўжыванні і рабуючы мясцовае насельніцтва[128]. Але болей зла прыносілі сапраўдныя бандыцкія палкі, якія збіліся з былых канфедэратаў. Найбольш розгаласу нарабілі рабаўнікі Яна Карвацкага. Яны прайшліся летам 1614 г. ад Гомеля на захад, аж да Прусіі, злупіўшы Падляшша, Малапольшчу, і толькі калі вясной 1615 г. вярталіся з Валыні ў ВКЛ, іх разграміў на пераправе цераз Буг С. Жалкеўскі. Правадыра свавольнікаў пасадзілі на палю ў Львове[129]. Рэагуючы на запіс у гарадзенскія гродскія кнігі, звароты прускага герцага і ўраднікаў дзеля „правядзення інквізіцыі і ўчынення справедлівасці", падліку стратаў Прусіі і памежжа летам 1615 г. ад рабаўнікоў (палкоўніка Яна Карвацкага і яго малодшага брата (таварышы два Канцэвіча, Вітовіч), ротмістраў Свідзерскага (таварышы Вольскі, Грабоўскі, Ліпскі), братоў Янкоўскіх, Чыжа, паручніка Станіслава Свідзінскага, Камароўскага, К. Дарагастайскага) з удзелам шляхты і прасталюдзінаў гарадзенскага павету, Падляшша і татар ВКЛ). Кароль прызначыў камісарам у справе новаабранага маршалка ВКЛ Пятра Весялоўскага[130].

---

[127] LMAVB, f. 139–366, арк. 9.

[128] GStA, XX HA Ostpr., fol. №819, арк. 134–137; Ibidem, арк. 391–398.

[129] *Akta zjazdów stanów...*, op. cit., s. 186.

[130] GStA, XX HA Ostpr., fol. № 820, арк. 47. GStA XX HBA (H). Kasten 860.

Пасля таго, як іншы полк бандытаў пад зверхнасццю Г. Тупальскага, разрабаваў Копыль і забіў 130 чалавек, аб'яднаныя сілы Я. Сянкевіча і Я. Радзівіла 6.10.1616 г. пад Ігуменам разграмілі іх у сапраўднай бітве – „паклаўшы на пляцы трупам больш за 300". Пастаянная пагроза ад „прамёрзлых канфедэрацый" і рабаўнікоў даводзіла да роспачы грамадзян ВКЛ[131].

Нават законнае забеспячэнне размяшчанага дзяржаўнага войска на лежах – стацыі, ці на маршры, не кажучы аб канфедэратах, суправаджаліся такім разрабаваннем маёмасці сялянаў і землеўласнікаў, што Г. Філіпчак Коцур пры агульным аблічэнні выдаткаў ВКЛ з 1609 г. па 1618 г. на вайну з Масквой у 2105227 зл. прызнае, што немагчыма ўявіць памеры рэальных стратаў эканомікі. Жаўнеры, змест традыцыйнай і прапісанай у соймавых пастановах бочкі аўса і карца жыта з валокі па кошце 1 зл., выграбалі стацыі па 15–18 злотых з валокі[132]. На давесак бяды, злачынцы звычайна заставаліся непакаранымі, бо дзеля вяртання ўлады над войскам кароль у большасці выпадкаў дараваў жаўнерам ранейшыя злаўжыванні.

Разрабаванне стала прычынай таго, што на 12/23 лістапада 1613 г. быў скліканы першы надзвычайны вальны сойм з адзінай мэтай – каб прыняць падаткі на аплату канфедэратам з інфлянцкіх і маскоўскіх кампаній. Маршалкам яго быў абраны Аляксандр Гасеўскі. Перад вальным соймам Галоўны з'езд ВКЛ 9/18.11.1613 г. вызначыў на аплату інфлянцкім і Берасцейскім канфедэратам („сапежынцам") усе свае падаткі, прычым загадаў іх сабраць ужо на 8.12.1613 г. і запатрабаваў адказу гвалтам на гвалт адносна нізавых казакоў і банд свавольнікаў. Дзеля гэтага пад павятовыя і гарадскія харугвы ўжо праз месяц, на Грамніцы, ваяводы, кашталянны, павятовыя маршалкі і гарадскія ўлады павінны былі сабраць атрады самааховы і абраць ім ротмісті-

[131] Г. Сагановіч, *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.*, „Беларускі гістарычны агляд", 2008, t. 15(28–29), s. 100–123; A. Przepiorka, K. Żojdź, *Dwa komputy wojska Wielkiego Księstwa Litewskiego z pierwszej połowy 1615 roku*, „Rocznik Lituanistyczny" 2020, t. 6, s. 282.

[132] A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648. Projekty-ustawy-realizacja*, Warszawa 2006, s. 301.

страў. Кароль мусіў выдаць тым ротам прыпаведныя лісты, адрамантаваць памежныя замкі, забяспечыць іх войскам і зброяй, а так сама ўсе зрабіць, каб вызваліць палонных. Дзеля фінансавання мабілізацыі і разліку з канфедэратамі быў абвешчаны афіцыйна агульны дадатковы збор валочнага (замест звычайных 1 аж па 4 злотых з валокі), шосавы, падвойны пагалоўны жыдоўскі і татарскі[133].

Гэты рэкордны чатырохкротны збор дадаўся да раней ухваленых і сабраных у скарб ВКЛ з красавіка па лістапад 1613 г. экстаардынарных падаткаў: патройнага валочнага і шосавага, патройнага пагалоўнага жыдоўскага і падвойнага пагалоўнага з татар і шкотаў, данатывы са святарства ўсіх канфесій, чопавага, мыта з купецкіх і шляхецкіх тавараў і кварты з каралеўшчын у ВКЛ на два гады. У выніку ВКЛ выплаціў жаўнерам агулам 833253 злотых, з якіх канфедэратам: берасцейскім – 541716, сталічным – 10741, смаленскім – 22923, інфлянцкім – 180535 зл. адпаведна, акрамя таго кампенсацыю за выдаткі і за тое „што да канфедэрацыі не ўвязаліся" ў 13525 зл. атрымаў А. Гасеўскі[134]. Апроч вялізарных выплат удзельнікам маскоўскіх і інфлянцкіх кампаній, рашэннем варшаўскага сойму скарб ВКЛ у 1613 г. павінен быў кампенсаваць Я. К. Хадкевічу 29230 зл., якія той раней выдаў на аплату жаўнерам[135]. Магнаты ВКЛ –Сапегі, Дарагастайскія, Валовічы, Тышкевічы – выдаткоўвалі таксама значныя сумы, а парнаўскі стараста Януш Кішка наняў на службу ў Маскве роту, заплаціўшы ім 4650 зл.[136]

Злоўжыванні войска, нябывалыя семякротныя падаткі, якія абвесцілі і сабралі за два гады, але разлік зацягваўся, злавала не толькі шляхту, але і Я. К. Хадкевіча. Вялікі гетман ВКЛ пісаў „вострыя лісты" да караля, якія той не хацеў чытаць[137]. У адносінах паміж імі наступіла ахалоджанне. Я. К. Хадкевіч нават зышоўся ў ліставанні з крытыкай двара і антылітоўскіх дзеянняў палякаў са сваім былым ворагам – Я. Радзівілам, асабліва калі той пераняў вясной 1614 г. месца князеў слуцкіх у сенаце ВКЛ і дазволіў вялікаму гетману ВКЛ карыстацца

---

133 *Akta zjazdów stanów...*, op. cit., s. 179–182.

134 A. Filipczak-Kocur, *Skarbowość Rzeczy Pospolitej 1587–1648...*, op. cit., s. 291.

135 Volumina legum, t. III, op. cit., s. 100–101.

136 НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 189.

137 LMAVB, f. 9–431, арк. 168–169.

з любых запасаў у сваіх ўладаннях[138]. Пры двары адразу пачаліся інтрыгі, каб пасварыць нечаканых ал'янтаў. Я. Радзівілу ў траўні 1614 г. давялося вытлумачацца перад гетманам, што ён не мае стасункаў з былым маршалкам канфедэратаў 1607 г. Георгам Цыклінскім, які на той час ужо быў адным з хадкевічаўскіх ротмістраў на Магілёве і Воршы[139].

Віленская канвакацыя ў кастрычніку 1614 г. абвінаваціла палякаў у спробе пазбяганні супольных, згодна ўмовамі ўніі цяжараў „у той нешчаслівай вайне ў якую разам зацягнутыя"[140]. Пасламі ад смаленскіх жаўнераў на Віленскую канвакацыю ў кастрычніку 1614 г. прыехалі смаленскі стражнік Мікалай Варанец[141], Адам Вішнеўскі і Андрэй Свейкоўскі. Нягледзячы на ранейшыя абяцанні і выдаткі, якія панеслі магнаты на яе ўтрыманне, залога ВКЛ на Смаленску служыла ў доўг, таму канфедэравалася і абяцала зыйсці з муроў ужо падчас канвакацыі – 10.10.1614 г. Паслы ад „смаленцаў" сустрэлі поўнае паразуменне сярод сенатараў і паслоў, былых ваяроў з інфлянцкіх і маскоўскіх войнаў (М. Глябовіч, Т. Скумін Тышкевіч, С. Маскевіч і інш.). Галоўны з'езд ВКЛ прасіў караля і сойм прызначыць смаленскай залозе дароўную чвэрць за цвёрдасць у абароне, а таксама кампенсаваць выдаткі Я. Кішку, А. Гасеўскаму і Аляксандру Дажджбогу Сапегу на залогі Смаленска і памежжа, Крыштофу Друцкаму Сакалінскаму – за адбудову Езярышчанскага замку (у 1612 г. ен там забяспечваў гарнізон у 100 пяхоты)[142], Яну Войне Ясінецкаму – за наём гарнізона на Вялікія Лукі, Мікалаю Францкевічу Радзьмінскаму – за ўтрыманне Мсціслаўскага замку, а ротмістру Канстанціну Залескаму – за службу паўтары чвэрці на падмаскоўным Барысаве і Мажайску.

Станы ВКЛ звярнуліся да караля, каб той забяспечыў і адрамантаваў ўмацаванні Смаленска, Полацка і Віцебска, а іх ваяводаў (Мікалая Глябовіча, Міхаіла Друцкага Сакалінскага, Яна Завішу адпаведна) вызваліў ад падаткаў з-за іх ранейшых выдаткаў на абарону і разрабаванне іх

---

[138] BRacz, rkps. 77, №31, 38.

[139] BRacz, rkps. 77, №40.

[140] *Akta zjazdów stanów...*, op. cit., s. 185.

[141] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie. XIV–XVIII wiek*, Warszawa 2003, s. 200.

[142] НГАБ, КМФ-18, спр. 293, воп. 1, арк. 119–119 аб.

маёнткаў жаўнерамі. Канвакацыя папрасіла падскарбія ВКЛ не патрабаваць аддання ў скарб сродкаў: ад полацкага паборцы Мікалая Сакоўскага 100 зл., якія той з падатковых грошай выдаў на набыццё пораху і рамонт гармат на полацкім замку; ад наваградскага паборцы Рыгора Валадковіча 1170 зл., якія ў яго забралі канфедэраты; ад слонімскага паборцы Юрыя Мялешкі 1000 зл., выданых па загадзе павятовай шляхты з сабраных падаткаў на наём войска, якім паспяхова адбілі напад нізавых казакоў на павет; пераразалічыць мсціслаўскай шляхце 1700 зл., выданых на ўтрыманне некалькіх сотняў кавалерыі ў ваяводстве. Дзеля разгрому банд свавольнікаў вялікі гетман ВКЛ Я. К. Хадкевіч атрымаў ад гэтай жа канвакацыі пацверджанне паўнамоцтваў на выстаўленне ўласных прыпаведных лістоў, не чакаючы на каралеўскія.

Нягледзячы на неабходнасць набора войска, галоўны з'езд ВКЛ пайшоў у фарватары інтарэсаў шляхты і магнатаў, аргументуючы кепскай якасцю выбранцоў і цяжкасцю іх выпраўлення, замяніла выданне рэкрутаў з маёнткаў на збор па злотаму і прапанаваў, каб гарады таксама выстаўлялі выбранцоў. Пасламі ад канвакацыі 1614 г. да караля сталі былыя ротмістры А. Гасеўскі і Ян Чыж[143]. Варшаўскі вальны сойм павінны быў вырашыць шмат важных пытанняў і з лістапада 1614 г. па студзень 1615 г. займаўся справамі прускай спадчыны, міра з Масквой, судоў і пакарання злачынцаў, але раз'ехаўся без ухвал.

Такім чынам, шляхта ВКЛ не толькі фінансавала, але прысутнічала ў шэрагах ваяроў пад Клушынам 1610 г., пры аблозе і ўтрыманні Смаленска, Масквы і іншых гарадоў 1609–1614 г. Вайна ў Інфлянтах ў 1609 г. і нежаданне магнатэрыі ВКЛ уцягвацца ў вялікую вайну з Масквой прывяло да таго, што каронная шляхта разам з магнатэрыяй рускіх земляў Кароны і казакамі была больш шматлікай у вайсковых абозах і гарнізонах на пачатковым этапе вайны 1609–1611 г. Калі ж вайна пачала зацягвацца, вядучая роля ў забеспячэнні маскоўскага гарнізона перайшла да Я. П. Сапегі, В. Будзілы, А. Гасеўскага і Я. К. Хадкевіча. Спроба адблакіроўкі і ўтрымання Масквы ў 1612 г. праводзілася ўжо войскамі ВКЛ, „рускай" магнатэрыі і казацтва Польскага каралеўства. Карона і ВКЛ разлічыліся са сваімі грамадзянамі асобна ў Львове і Берасці за 1614 г. Пасля таго як у 1613–1614 г. Смаленскае ваяводства

[143] Ibidem, s. 182–202.

стала часткай ВКЛ, у Маскве абралі новага цара, а дзеля супакаення канфедэратаў з маскоўскіх кампаній, запатрабаваліся вайсковыя аперацыі – нясенне асноўнага цяжару вайны ў 1613–1618 г., нягледзячы на максімальныя да таго часу падатковыя высілкі літоўскай шляхты, лягло на плечы ВКЛ.

## References


**1.Архіўныя крыніцы**

Rasìjskaâ Nacyânal'naâ bìblìâtèka ŭ Sankt-Pecârburgu (RNB)], f. 971, „Aŭtografyp. P. Dubroŭskaga", vop. 2, aŭt. 63/2, ark. 39 [Расійская Нацыянальная бібліятэка ў Санкт-Пецярбургу (РНБ)], ф. 971, „Аўтографы П. П. Дуброўскага", воп. 2, аўт. 63/2, арк. 39].

Nacyjanalny Gistaryczny Archiu Belarusi. Нацыянальны Гістрычны Архіў Беларусі (НГАБ), КМФ-18, спр. 86, воп. 1. арк. 633, 663, 745, 832, 834, 837, 841, 843, 851, 866; ф. 289, воп. 1, арк. 188, 320, 338, 375; спр. 293, воп. 1, арк. 66аб.–67, 106, 108аб., 119, 149, 155, 153, аб155аб, 171, 176, 177, 189, 217–219, 220.

Geheimes Staatsarchiv Preußisher Kulturbesitz. XX HA Königsberg Ostpreußishe Staatsarchive. Kriegssachen. Folianten (GStA XX HA Ostpr. K. Fol.) [Сакрэтны дзяржаўны архіў Прускай культурнай спадчыны. Кёнігсбергскі Усходнепрускі Дзяржаўны Архіў, Пытанні вайны (1600–1629). Фаліянты.] № 815, арк. 321, 323; fol. № 818, арк. 13, 18; fol. № 819 арк. 51, 134–137, 391–398; fol. № 820, арк. 47.; XX Herzogliches Briefarchiv (GStA XX HBA (H) Kasten) [Архіў лістоў князёў. Скрынкі] № 850, 860.

Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów (AGAD–AR), dział II, sygn. 613; AR II Suplement 243; sygn. 238, арк. 2–3.

Archiwum Narodowe w Krakowie. Archiwum państwowe na Wawelu (APW), AS (Archiwum Sanguszków Sławuckie), rkps. sygn. № 51.

Biblioteka książąt Czartoryjskich (BCzart.), sign. 102, № 117; sign. 104, № 216, 189, 188; sign. 2073, № 69 (295); sign, 2245, № 10.

Biblioteka Kórnicka Polskiej Akademii nauk. Dział Rękopisów (BK PAN w Kórniku), rkps. 1591, арк. 57–64.

Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Nauk i Polskiej Akademii Umiejętności (BN PAN PAU w Krakowie), rkps. sygn. 360, арк. 224; sygn. 363, арк. 23, № 29; sygn. 365, арк. 41, 49, 52.

Biblioteka Raczynskich (BRacz.) BRacz, rkps. 33, арк. 254; rkps. 75, арк. 5, 27–32, 38a, 40; rkps. 77, № 173.

Lietuvos Mokslu Akademijos Vrublevskiu Biblioteka (LMAVB) [Бібліятэка Літоўскаай Акадэміiі навук імя Урублеўскага], f. 17–178, арк. 5–6; f. 139–366, арк. 5, 9; f. 9–431, арк. 154, 156, 157, 158, 168–169; f. 9–431, арк. 143.

Latvijas Valsts vēstures arhīva (LVVA) [Латвійскі дзяржаўны гістарычны архіў], f. 673–Ap. 1–Lietas, nr. 1224, арк. 78–79.

**2. Літаратура**

Ambrozâk T., *Granica meždu Reč'û Pospolitoj i Moskovskim gosudarstvom v vystupleniâh litovskih sejmikov v pervoj polovine XVII v.*, „Metamorfozy istorii" 2022, № 19, s. 7–26 [Амброзяк Т., *Граница между Речью Посполитой и Московским государством в выступлениях литовских сеймиков в первой половине XVII в.*, „Метаморфозы истории" 2022, № 19, с. 7–26].

Ambrozâk T., *Otnošenie litovskih sejmikov k Smute i intervencii Reči Pospolitoj*, [v:] *Smuta kak istoričeskij i sociokul'turnyj fenomen. Materialy vserosijskoj naučnoj konferencii 22.04.2013*, Moskwa 2013, с. 179–185 [Амброзяк Т., *Отношение литовских сеймиков к Смуте и интервенции Речи Посполитой в Москве*, [в:] *Смута как исторический и социокультурный феномен. Материалы всеросийской научной конференции 22.04.2013*, Москва 2013, с. 179–185].

Bohun T., *Pol'sko-litovskij garnizon v Kremle (1610–1612* gg.*)*, [v:] *Smuta v Rossii i Potop v Reči Pospolitoj: opyt preodoleniâ gosudarstvennogo krizisa v XVII stoletii. Materialy Rossijsko-pol'skoj naučnoj konferencji, Moskva 24–26.10.2012 g.*, red. A. V. Ûrasov, A. V. Malov, Moskva 2016, s. 194–209 [Бохун Т., *Польско-литовский гарнизон в Кремле (1610–1612 гг.)*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. Москва, 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 194–209].

Gralâ H., *Vozroždenieiz nebyti*â: *Smuta i Potop na pereput'âh nacional'nyh mifologij*, [v:] *Smuta v Rossii i Potop v Reči Pospolitoj: opyt preodoleni*â *gosudarstvennogo krizisa v XVII stoletii. Materialy Rossijsko-pol'skoj naučnoj konferencji, Moskva 24–26.10.2012 g.*, red. A. V. Ûrasov, A. V. Malov, Moskva 2016, s. 10–48 [Граля Х., *Возрождение из небытия: Смута и Потоп на перепутьях национальных мифологий*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 10–48].

Dzemìdovìč A., *Vâlìkae Knâstva Lìto'skae ŭadnosìnah Rèčy Paspalìtaj z Rasìej ì Švecyâj u peršaj trècì XVII st.*, Minsk 2021 [Дземідовіч А., *Вялікае Княства Літоўскае ў адносінах Рэчы Паспалітай з Расіей і Швецыяй у першай трэці XVII ст.*, Мінск 2021].

*Dnevniki Âna Petra Sapegi (1608–1611)*, [v:] *Pamâtniki Istorii Vostočnoj Evropy. Istočniki XV–XVII v.*, sost. I. Tûmencev i dr., Moskva 2012, t. IX [*Дневники Яна Петра Сапеги (1608–1611)*, [в:] *Памятники Истории Восточной Европы. Источники XV–XVII в.*, сост. И. Тюменцев и др., Москва 2012, т. IX].

*Dnevnik" sobytìj, otnosâŝihsâ k" Smutnomu vremeni (1603–1613* gg.*), izvěstnyj pod" imenem" istorìi ložnago Dimitrìâ (Diariusz J. Budziłły)*, [v:] *Russkaâ istoričeskaâ biblioteka*, SPb. 1872, t. 1. *Pamâtniki, otnosâŝiesâ k Smutnomu vremeni*, s. 81–364 [*Дневникъ событій, относящихся къ Смутному времени (1603–1613 гг.),* извѣстный подъ именемъ исторіи ложнаго Димитрія (*Diariusz J. Budziłły)*, [в:] Русская историческая библиотека, Спб. 1872, т. 1. *Памятники, относящиеся к Смутному времени*, с. 81–364].

Malov A., *Vyhodcy iz Reči Pospolitoj na službe Mihaila Fedoroviča na zaveršaûŝem ètape Smuty 1613–1619*, [v:] *Smuta v Rossii i Potop v Reči Pospolitoj: opyt preodoleni*â *gosudarstvennogo krizisa v XVII stoletii. Materialy Rossijsko-pol'skoj naučnoj konferencji, Moskva 24–26.10.2012 g.*, red. A. V. Ûrasov, A. V. Malov, Moskva 2016, s. 210–244 [Малов А., *Выходцы из Речи Посполитой на службе Михаила Федоровича на завершающем этапе Смуты 1613–1619*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 210–244].

*Pamâtniki smutnogo vremeni. Tušinskij vor: ličnost', osokruženie, vremâ. Dokumenty i materialy*, [v:] *Trudy istoričeskogo fakul'teta MGU*, sost., vst. stat'ta i kommentarii V. Kuznecova i I. Kulakovoj, Moskva 2001, seriâ 1. *Istoričeskie istočniki*, №10 [*Памятники смутного времени. Тушинский вор: личность, окружение, время. Документы и материалы*, [в:] *Труды исторического факультета МГУ*, сост., вст. статья и комментарии В. Кузнецова и И. Кулаковой, Москва 2001, серия 1. *Исторические источники*, № 10].

Pšepûrka A., Polâki na službe Samozvancev, [v:] *Smuta v Rossii i Potop v Reči Pospolitoj: opyt preodoleniâ gosudarstvennogo krizisa v XVII stoletii. Materialy Rossijsko-pol'skoj naučnoj konferencji, Moskva 24–26.10.2012 g.*, red. A. V. Ûrasov, A. V. Malov, Moskva 2016, s. 179–193 [Пшепюрка А., *Поляки на службе Самозванцев*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 179–193].

Saganovìč G., *VKL ì vajskovy*â *kanfedèracy*ì 1612–1614 *gg.*, „Belaruskì gìstaryčny aglâd" 2008, t. 15, s. 100–123 [Сагановіч Г., *ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг.*, „Беларускі гістарычны агляд" 2008, т. 15, с. 100–123].

Florâ B., *Russkoe obŝestvo v Èpohu Smuty*, [v:] *Smuta v Rossii i Potop v Reči Pospolitoj: opyt preodoleniâ gosudarstvennogo krizisa v XVII stoletii. Materialy Rossijsko-pol'skoj naučnoj konferencii. Moskva, 24–26.10.2012 g.*, red. A. V. Ûrasov, A. V. Malov, Moskva

2016, s. 49–68 [Флоря Б., *Русское общество в Эпоху Смуты*, [в:] *Смута в России и Потоп в Речи Посполитой: опыт преодоления государственного кризиса в XVII столетии. Материалы Российско-польской научной конференции. Москва, 24–26.10.2012 г.*, ред. А. В. Юрасов, А. В. Малов, Москва 2016, с. 49–68].

Âkubaŭ V., *Udzel gramadzân VKL u vojsku II Ìlžèdzmìtryâ1608–1610 g.* [Якубаў В., *Удзел грамадзян ВКЛ у войску ІІ Ілжэдзмітрыя 1608–1610 г.*], „Przegląd Środkowo-Wschodni" 2024, № 9, s. 9–49.

*Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, ed. H. Lulewicz, Warszawa 2009, t. 2.

Bohun T., *Wymiana Jeńców w Ramach Rozejmu Dywilińskiego*, „Vestnik Volgogradskogo gosudarstvennogo universiteta. Istoriâ.Regionovedenie. Meždunarodnye otnošeniâ", Volgograd, t. 24, seriâ 4, № 2, s. 176–183 [Bohun T., *Wymiana Jeńców w Ramach Rozejmu Dywilińskiego*, *„Вестник Волгоградского государственного университета. История. Регионоведение. Международные отношения"*, Волгоград 2019, т. 24, серия 4, № 2, с. 176–183].

Bohun T., *Moskwa 1612*, Warszawa 2005.

Filipczak-Kocur A., *Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648*, *Projekty-ustawy-realizacja*, Warszawa 2006.

Majewski A., *Moskwa 1617–1618*, Warszawa 2006.

Niesiecki K., *Herbarz polski*, Lipsk 1839, t. III, IV.

Niesiecki K., *Herbarz polski*, Lipsk 1842, t. IX.

Niesiecki K., *Herbarz polski*, Lipsk 1840, t. V. Niesiecki K., *Herbarz polski*, Lipsk 1841, t. VI.

*Pamiętniki Samuela Maskiewicza początek swój biorą od roku 1594 w lata po sobie idące*, Wilno 1838.

Podhorodecki L., *Stanisław Żółkiewski*, Warszawa 1988.

Przepiórka A. G., *Liczebność i organizacja załogi Smoleńska w latach 1613–1618*, „Res Historica", Lublin 2024, t. 57.

Przepiórka A., Żojdż K., *Dwa komputy wojska Wielkiego Księstwa Litewskiego z pierwszej połowy 1615 roku*, „Rocznik Lituanistyczny" 2020, t. 6, s. 274–275.

Sikora R., *Niezwykle bitwy i szarże husarii*, Warszawa 2011.

Szczęśniak R., *Kłuszyn 1610*, Warszawa 2004.

*Szwedzkie wojny 1611–1632. Wojny z Danią i Moskwą*, Oświęcim 2015, t. 1, 2.

Uruski S., *Rodzina*: *Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1904, t. I.

Uruski S., *Rodzina Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa1909, t. IV, VI.

Uruski S., *Rodzina: Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1910, t. VII.

Uruski S., *Rodzina: Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1915, t. XII.

Uruski S., *Rodzina: Herbarz szlachty polskiej*, Warszawa 1917, t. XIV.

*Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie. XIV–XVIII wiek*, Warszawa 2003, t. IV.

*Volumina legum*, red. J. Ohryzka, t. III, St. Petersburg 1860.

Żojdż K., *Wszyscy ludzie króla: Zygmunt III Waza i jego stronnicy w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszych dekadach XVII wieku*, Toruń 2019.